Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

23 ЖНІЎНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 164 (29786)

ГРЭБУЕМ СТАРЫМІ І МАЛАДЫМІ 7

БУЛКА-ГАДАЛКА І МАТУЛІН КАРАВАЙ 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый ЯРАШЭВІЧ, намеснік міністра эканомікі:

«Эканоміка краіны знаходзіцца ў збалансаваным, устойлівым стане, наступствы зніжэння ВУП для грамадзян, у прыцыпе, неадчувальныя. Калі казаць аб тым, ці перабудавалі прадпрыемствы парушаныя лагістычныя ланцужкі, трэба адзначыць, што па кан'юнктурных апытаннях, якія мы праводзім, недзе 60 працэнтаў гэту задачу ўжо вырашылі. Урадам былі прыняты меры падтрымкі для малога бізнесу, а таксама буйных прадпрыемстваў. Гэтыя меры запатрабаваныя нашым рэальным сектарам, бізнесам. Таму мы такую работу прадоўжым і ў далейшым. Сёння дзяржава максімальна падтрымлівае прадпрымальнікаў. У прыватнасці, Прэзідэнт паставіў задачу рэалізаваць не менш за адзін інвестыцыйны праект у кожным з раёнаў краіны. Думаю, мясцовая ўлада будзе ўсяляк садзейнічаць развіццю бізнесу. Цяпер час магчымасцяў, і іх трэба максімальна выкарыстоўваць».

Хлебная вахта

Свой чарговы жнівеньскі адпачынак ужо шаснаццаты сезон запар жыхар вёскі Агарэвічы Ганцавіцкага раёна **Сяргей ДУЛІК** праводзіць... на хлебных палетках Міншчыны. Згадзіцеся, незвычайная традыцыя ў інжынера-механіка аднаго з ганцавіцкіх прадпрыемстваў — «бавіць» час на цяжкім і адказным жніве ды яшчэ за дзвесце кіламетраў ад дома. Мне давялося пазнаёміцца з гэтым статным мужчынам з прыветлівай усмешкай на адным з палёў акцыянернага таварыства «Агра-Абярэг», дзе здымаўся чарговы фотарэпартаж. У нас было толькі пяць хвілін для размовы і пошукаў патрэбнага ракурсу, бо нельга займаць дарагі час у хлебароба, тым больш у самы разгар працы.

— Шчыраваць на жніве для мяне амаль як хобі, за славай я не ганюся. З пятнаццаці гадоў быў памочнікам на камбайне, мой бацька і дзядзька былі трактарыстамі і камбайнерамі — гэта перадалося і мне. Камбайн «Палессе 1218» замацаваны за мною, хоць я і не адсюль, але сам абслугоўваю агрэгат, даглядаю, рамантую. Дарэчы, гэта ўжо другі камбайн, перад тым чатырнаццаць сезонаў малаціў на «Палессе 10». Закончыцца жніво, праверу знос механізмаў, падрамантую і здам камбайн на захоўванне да наступнага сезона, — кажа Сяргей Міхайлавіч. — Наогул, працую з ахвотаю. За дзень, калі добрае надвор'е і ўраджай на славу, намалочваю па дзевяць-дзесяць бункераў, бывае, што і больш. Мне пашчасціла: гаспадарка моцная і ўраджаі заўсёды высокія.

Сяргей Дулік працаваў у зладжаным механізаваным атрадзе з дзевяці камбайнаў. У тым, што гаспадарка своечасова завяршыла жніво і ўжо «ўзяла» дзесяцітысячны рубеж намалоту збожжавых, ёсць доля высілкаў працавітага і жыццелюбівага палешука. А гэтымі днямі Сяргей апрацоўвае прысядзібныя ўчасткі, учора ён дажынаў агароды ў вёсцы Падгацце Пухавіцкага раёна.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Мы там былі...

СВЯТОЧНЫ ЗАРАД АД ПАЛЕШУКОЎ

Частаваў прысмакамі, захапляў рамёствамі, кружыў у танцавальнай віхуры... Самы малады фестываль Гомельскай вобласці «Кліч Палесся» ў сёмы раз сабраў на Петрыкаўшчыне амаль 40 тысяч удзельнікаў і гасцей не толькі з розных куткоў Беларусі, але і расійскіх рэгіёнаў.

СТАР. 8

Тэхналогіі бяспекі

ПАРАДЫ ДЛЯ ЛІЧБАВАЙ ГІГІЕНЫ

Забяспечыць ахову асабістых даных у інтэрнэце можа сам чалавек

Геалакацыя, указаная на фотаздымку. Копія пашпарта, дасланая на электронную пошту. Адкрыты профіль у сацыяльных сетках, дзе змешчана шмат прыватнай інфармацыі. Гэтыя і іншыя рэчы, якія часта пакідае гаспадар усіх падобных звестак, з'яўляюцца вялізнай крыніцай, з якой зламыснікі могуць поўнымі вёдрамі чэрпаць інфармацыю. Што можна зрабіць самастойна, каб паменшыць паток збору і апрацоўкі інфармацыі пра сябе, расказалі ў Нацыянальным цэнтры аховы персанальных даных (НЦАПД).



СТАР. 5

КАРАТКА

• Нацыянальны статыстычны камітэт Беларусі ўжо вядзе падрыхтоўку да наступнага перапісу насельніцтва, паведаміла старшыня Белстата Іна Мядзведзева.

• **Забароны і абмежаванні на наведванне лесу працягваюць дзейнічаць у большасці раёнаў Беларусі. Аператыўна адсачыць сітуацыю можна на сайце Мінлясгаса з дапамогай інтэрактыўнай карты.**

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«СПАДЗЯЮСЯ, ШТО СТАНОЎЧАЯ ДЫНАМІКА ЗАХАВАЕЦЦА»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прадставіў новага кіраўніка справамі Прэзідэнта Юрыя Назарава. Тыдзень таму, 16 жніўня, кіраўнік дзяржавы прыняў шэраг кадравых рашэнняў. Валерый Іваноў, які ўзначальваў Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта апошнія гады, звярнуўся з хадайніцтвам аб пераходзе на іншую работу. Аляксандр Лукашэнка гэтую просьбу падтрымаў.

Юрый Назараў да свайго новага прызначэння займаў пасаду віцэ-прэм'ера, курыраваў пытанні развіцця машынабудаўніцтва, нафтахіміі, дрэваапрацоўкі і навукі.

Як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, работа ў сферы кіравання справамі Прэзідэнта для Юрыя Назарава не новая. З 2010 да 2013 года ён займаў там пасаду намесніка кіраўніка.

«Кіраўніцтва справамі — структура асаблівая ў органах дзяржаўнай улады. Тут вырашаюцца пытанні агульнадзяржаўнага значэння. І пасада кіраўніка справамі ў кадравым рэестры размешчана ў верхнім радку як вышэйшая службовая асоба. Гэта значыць, што, акрамя гэтых функцый, у яго кампетэнцыю ўваходзіць усё — трэба вырашаць усе тыя задачы, якія вырашаюцца на тэрыторыі краіны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Першыя сярод гэтых задач — забеспячэнне дзейнасці Прэзідэнта, арганізацыйна-матэрыяльнае забеспячэнне дзяржаўных мерапрыемстваў самага высокага ўзроўню. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Кіраўніцтва справамі ўмее тое рабіць і рабіла заўсёды прафесійна.

З'яўляючыся рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваным непасрэдна Прэзідэнту, Кіраўніцтва справамі мае разгалінаваную шматгаліновую вытворчую базу, у якую ўваходзіць каля 70 арганізацый з колькасцю працуючых больш за 27 тысяч чалавек. «Я называю гэтыя лічбы для тых, хто думае, што кіраўнік справамі і Кіраўніцтва створаны выключна для таго, каб круціцца вакол Прэзідэнта і выконваць яго капрызы. Нічога падобнага», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Медыцынскія і турыстычныя паслугі

Прэзідэнт вылучыў некаторыя пытанні, на якія новаму кіраўніку справамі трэба звярнуць асаблівую ўвагу. Адно з іх звязана з Рэспубліканскім клінічным медыцынскім цэнтрам, які ўваходзіць у структуру Кіраўніцтва. Гэта высокатэхналагічная ўстанова з найноўшым сучасным абсталяваннем і кваліфікаванымі, добра падрыхтаванымі кадрамі. Медперсанал Цэнтра здольны выконваць самыя складаныя кардыялагічныя, артапедычныя і іншыя аперацыі.

«Задача Кіраўніцтва справамі — садзейнічаць развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы цэнтра, а таксама пашырэнню экспарту медыцынскіх паслуг», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт таксама звярнуў увагу на кадры, якія працуюць у Цэнтры. Па яго словах, Кіраўніцтва справамі павінна ведаць, што гэта за людзі. «Інакш атрымаецца як у 2020 годзе: мы некаторых лячылі, а яны з дубінамі потым выйшлі супраць тых, хто іх лячыў», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

У склад Кіраўніцтва справамі таксама ўваходзіць шэраг санаторыяў, размешчаных у самых прыгожых мясцінах Беларусі і ўнікальных кліматычных рэгіёнах на ўзбярэжжы Чорнага мора. Гэта дасканалыя санаторна-аздараўленчыя ўстановы, якія аказваюць медыцынскія паслугі на самым высокім узроўні. Там адпачываюць, лечацца не толькі грамадзяне Беларусі, але і замежнікі. «У сувязі з запатрабаванасцю і запаўняльнасцю санаторыяў падумайце, як іх можна мадэрнізаваць, каб прыняць больш людзей і, адпаведна, зарабіць», — даручыў Прэзідэнт.

Нараўне з аздараўленнем Кіраўніцтва справамі прапануе турыстычны адпачынак у нацыянальных парках і Бярэзінскім біясферным запаведніку. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што неабходна аддаць больш увагі рэкламе прапаноў для сямейнага і турыстычнага адпачынку. «З улікам таго што такі адпачынак карыстаецца значным попытам, падумайце над пашырэннем спектра паслуг экалагічнага і пазнавальнага турызму», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што абмяркоўваў пашырэнне такіх паслуг з губернатарам Брэсцкай вобласці Юрыем Шулейкам, ён гатовы укладваць сродкі для пашырэння такіх паслуг. Аляксандр Лукашэнка даручыў Кіраўніцтву справамі абмяркаваць з кіраўніцтвам Брэсцкага аблвыканкама гэтыя пытанні.

«Але майце на ўвазе, перад Кіраўніцтвам справамі адначасова стаіць ключавая задача па захаванні запаведных мясцін», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў вынікі работы Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці. «Сфарміравана адзіная сістэма ўліку паступлення і размеркавання гуманітарнай дапамогі, створаны ўмовы для яе прадастаўлення шырокаму колу маючых патрэбу. У цэлым Дэпартамент працуе нядрэнна», — сказаў ён.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, у цэлым работа арганізацый, якія ўваходзяць у сістэму Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па выніках першага паўгоддзя нядрэнная. Ён расказаў, што на мінулым тыдні прымаў з дакладам былога кіраўніка справамі Валерыя Іванова, які далажыў аб паўтараразовым росце выручкі, атрыманага чыстага прыбытку — 100 мільёнаў рублёў. «Спадзяюся, што такая станоўчая дынаміка захаваецца», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт працягнуў спіс пытанняў, якім Юрый Назараў павінен удзяліць асаблівую ўвагу.

Першае — сельская гаспадарка

Неабходна падтрымліваць эфектыўнасць работы кожнай сельскагаспадарчай арганізацыі. Такую задачу паставіў Аляксандр Лукашэнка.

«У гэтых мэтах трэба забяспечыць жывёлагадоўлю кармамі ўласнай вытворчасці ў поўным аб'ёме. Вы ж разумееце, што гэта дазволіць знізіць затраты і не залежаць ад кан'юнктуры рынку збожжа. Сёння ў краіне актуальным пытаннем з'яўляецца ўборачная кампанія. Ведаю, што вашы прадпрыемствы ідуць у нагу з усёй рэспублікай, забяспечваючы высокія тэмпы ўборкі збожжавых. Убраны рапс, атрыманы добрыя ўраджаі — пад 30 цэнтнераў з гектара. Спадзяюся, год вы скончыце з тэмпам росту прадукцыі сельскай гаспадаркі не меншым, чым на 104 працэнты. Трэба не адстаць ад гэтых паказчыкаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён даручыў распаўсюдзіць вопыт работы мехатрада ААТ «Александрыйскае» на іншыя гаспадаркі.

Другое — стратныя арганізацыі

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, трэба вывесці стратныя арганізацыі на работу ў плюс.

«Як мне дакладваюць, шэраг арганізацый Кіраўніцтва справамі скончыў першае паўгоддзе са стратамі («Белмастацкераміка», «Слуцкія паясы», «Гасцініца «Планета», «Мэбля Інтэр'ер Цэнтр»). Такога па выніках года быць не павінна. Неэфектыўную работу трэба аператыўна і самыя кароткія тэрміны. Ніякіх стратных арганізацый у Кіраўніцтве справамі па выніках года не павінна быць!» — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Трэцяе — аб'ём экспарту

Прэзідэнт адзначыў, што аб'ёмы экспарту захаваныя практычна на ўзроўні мінулага года. Недабралі крыху больш за 1 працэнт. «Мне вядомыя прычыны. Спыненне паставак бітуму ва Украіну, праблемы з экспартам піламатэрыялаў у краіны Еўрапейскага саюза. Трэба актывізавацца. Ваша задача — вырашыць гэтыя праблемы», — сказаў ён. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, дыверсіфікацыя паставак такой прадукцыі — надзённае пытанне. Добра, што практычна ўсе выпадаючыя аб'ёмы перакрыты за кошт экспарту прадуктаў харчавання. «Аднак гэтага не хапіла. Трэба шукаць рынкі ў Паўднёваазіяцкім рэгіёне і іншых напрамках», — арыентаваў кіраўнік дзяржавы.

Чацвёртае — будаўніцтва жылля

Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта ажыццяўляе шэраг буйных праектаў па ўзвядзенні жылля, удзяляе ўвагу будаўніцтву новых і мадэрнізацыі дзеючых вытворчасцяў. «Гэта правільны падыход. Я буду гэты кірунак падтрымліваць», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Пятае — захаванне традыцый

Беларускі лідар звярнуў увагу, што пільнай увагі Кіраўніцтва справамі патрабуюць пытанні тэхнічнага перааснашчэння і мадэрнізацыі арганізацый аб'яднання «Белмастацпромыслы».

«Калі распаўся Савецкі Саюз, гэтыя арганізацыі былі асуджаныя на гібель. Яны былі кінутыя. Мне стала шкада ўнікальных людзей, якія там працавалі. Акрамя іх, ніхто б гэтую работу не зрабіў. Але ёсць і іншае — гэта школа. Мы не павінны згубіць гэтыя школы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Аднак у сучасных умовах захаваць вытворчасць вырабаў народных мастацкіх промыслаў у першародным выглядзе недастаткова. Неабходна яго мадэрнізаваць, праводзіць пастаянную работу па асваенні новай, запатрабаванай прадукцыі. Вопыт і традыцыі павінны быць перададзены нашым дзецям», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Арганізацыі павінны стаць узорам

Асобную ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на кадры. Ён упэўнены, што ў Кіраўніцтве справамі павінны працаваць высокакваліфікаваныя прафесіяналы сваёй справы, адданыя краіне. «Па-чалавечы, хто не згодзен, хто не можа працаваць у Кіраванні справамі Прэзідэнта, трэба ціхенька сысці і працаваць на іншай рабоце. У адваротным выпадку, такое ж стаўленне будзе і з нашага боку да іх. Здраднікаў нідзе не любяць», — канстатаваў ён.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Юрыю Назараву поспехаў і ўручыў службовае пасведчанне.

У сваю чаргу, Юрый Назараў падзякаваў за аказаны яму давер пры назначэнні на высокую пасаду. Ён адзначыў, што добра знаёмы з многімі работнікамі Кіраўніцтва справамі, таму «няма неабходнасці кудысьці ўнікаць, у чымсьці разбірацца». «Я ўпэўнены, што калектыў працаздольны. Я ведаю вашы патрабаванні да кіраўнікоў прадпрыемстваў. І запэўніваю, што мы выканаем любыя пастаўленыя задачы», — сказаў Юрый Назараў.

Валерыя СЦЯЦКО.

«Патрэбна інвеставаць у тое, што мы ўмеем рабіць»

Акрамя таго, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з намеснікам прэм'ер-міністра Пятром Пархомчыкам, які ўсяго некалькі дзён працуе на новай пасадзе. Да нядаўняга часу віцэ-прэм'ер з'яўляўся міністрам прамысловасці. Чалавек ён вопытны: прайшоў шлях ад рабочага да камерцыйнага дырэктара флагмана беларускай прамысловасці — Мінскага трактарнага завода. Некаторы час узначальваў яшчэ адзін прамысловы гігант краіны — Беларускі аўтамабільны завод.

На каласальны вопыт Пятра Пархомчыка звярнуў увагу і кіраўнік дзяржавы. Аднак адразу папярэдзіў: унікаць у пэўныя пытанні ўсё ж прыйдзецца. Калі прамысловасць для новага віцэ-прэм'ера — сфера абсалютна зразумелая, то энергетычны і нафтахімічны комплексы, лясная гаспадарка, дрэваапрацоўка з'яўляюцца адносна новымі кірункамі яго дзейнасці.

Імпартазамяшчэнне — пытанне нумар адзін

«Наша задача адна ў эканоміцы — не ўпасці ніжэй за мінулы год, — падкрэсліў беларускі лідар. — І галоўную ролю тут, вядома, павінна сыграць прамысловасць». Пры гэтым у прыклад прывёў сельскую гаспадарку, якая, па пераканнанні Прэзідэнта, выйдзе на абяцаныя параметры — 104 %. «Для гэтага ёсць усё, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — І надвор'е нас пашкадавала, парадавала. Мы практычна ўбралі — ідзём да фінішу — збожжавыя, каласавыя. Восем мільёнаў, напэўна, атрымаем у гэтым годзе. А можа, і 8,2 мільёна. Гэта будзе выдатна! Плюс рапс, кукуруза. І калі ўсё складзецца, як складваецца цяпер, то 11 мільёнаў — гэта будзе рэкорд для нашай краіны. Мы атрымаем якаснае зерне, каб людзей нашых накарміць і каб хапіла для вытворчасці камбікармоў».

Аляксандр Лукашэнка ў чарговы раз акцэнтаваў увагу на тым, што ў гэты перыяд вельмі важна асвоіць новыя рынкі. У прыватнасці, Прэзідэнт прывёў у прыклад Зімбабвэ, дзе таксама можна працаваць. «Не трэба адкідваць ніякія рынкі, — адзначыў беларускі лідар. — Можам працаваць на Захадзе — будзем працаваць на Захадзе. На Поўдні, Поўначы, Усходзе — там, дзе толькі мы патрэбныя, дзе патрэбная наша прадукцыя. Таму ні ад якіх рынкаў адмаўляцца не трэба».

Новыя праекты і інвестыцыі

Спыніўся кіраўнік дзяржавы і на важнасці інвестыцыйных праектаў. Пры гэтым заўважыў, што «хвост», хоць і невялікі, застаўся на нафтаперапрацоўчых заводах у Мазыры і Наваполацку. Прэзідэнтам пастаўлена задача — сур'ёзна ўзяцца за гэтыя пытанні і завяршыць іх. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, на поўную магутнасць павінна працаваць і БелАЭС.

Закранулі падчас сустрэчы і пытанне вытворчасці беларускіх аўтобусаў на заводзе МАЗ. «Вельмі перспектыўная сфера, не паспяваем задавальняць попыт, — заўважыў беларускі лідар. — Таму ўсё, што трэба для МАЗа зрабіць, падстрахуйце, запатрабуйце, дапамажыце, але развіваць аўтобусную вытворчасць трэба». І ў гэтым кантэксце кіраўнік дзяржавы згадаў нядаўнюю паездку на Мёрскі металапракатны завод. «Добрае прадпрыемства, можа працаваць, — адзначыў ён. — Трэба больш актыўна яго задзейнічаць».

Новыя праекты — аб гэтым таксама вялася размова. «Перш за ўсё, «Гродна Азот», «Светлагорскі ЦЦК», — удакладніў Прэзідэнт. — Па паперы мы гаварылі аб паглыбленай перапрацоўцы. Гэта таксама павінна быць даведзена да дасканаласці, каб мы не прадавалі паўфабрыкат, а прадавалі гатовыя вырабы і сябе забяспечылі кардонам і ўпакоўкай».

Аляксандр Лукашэнка перакананы: «Патрэбна інвеставаць у тое, што мы ўмеем рабіць». І нічога, па яго словах, не трэба выдумляць. Такім чынам, задача ад кіраўніка дзяржавы — паглыбленне тых кірункаў, якія сёння даюць эфект і запатрабаваныя на рынках.

Вераніка КАНЮТА.

У тэму

У гутарцы з журналістамі **Пётр ПАРХОМЧЫК** адзначыў, што галоўная задача, якую патрэбна вырашыць, — не дапусціць зніжэння аб'ёмаў вытворчасці, забяспечыць рост экспарту, не дапусціць павелічэння запасаў на складах. Пры гэтым, па яго словах, калі сёння па Міністэрстве прамысловасці такіх пытанняў не існуе, ёсць станоўчая дынаміка, станоўчыя вынікі, то па асобных галінах — у прыватнасці «Беллегпром», «Белнафтахім» — трэба пагрузіцца як мага глыбей, знайсці ўсе прычыны і пастарацца аказаць на іх істотны ўплыў, каб была станоўчая дынаміка.

Таксама віцэ-прэм'ер паведаміў, што Прэзідэнт звярнуў увагу на пытанні ў частцы імпартазамяшчэння. І канкрэтныя прыклады ўжо ёсць. У прыватнасці, гаворка падчас сустрэчы ішла пра Мёрскі металапракатны завод, дзе не так даўно пабываў Аляксандр Лукашэнка. «Ёсць упэўненасць, што тыя дзеянні, якія былі прынятыя, ужо даюць станоўчыя вынікі», — адзначыў Пётр Пархомчык.

ВЫСОКАЯ АЦЭНКА ДЗЕЙНАСЦІ КІРАЎНІЦТВА КРАІНЫ

Даныя сацдаследавання: амаль 80 працэнтаў беларусаў задаволены сваім жыццём

Амаль 80 працэнтаў беларусаў задаволены сваім жыццём. Такія даныя сацыялагічнага даследавання «Сацыяльнае мысленне пад санкцыйным рэжымам» карэспандэнту БелТА прывёў кіраўнік Аналітычнага цэнтра ЕсооМ Сяргей МУСІЕНКА.

Рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанне: «Наколькі вы задаволены жыццём, якое ведзяце?»

«Многія пытанні гэтага сацдаследавання дубліруюць тыя папярэднія вялікія работы, якія мы выконвалі перад рэферэндумам, Усебеларускім народным сходам. У нас з'явілася цікавая база для параўнання на працягу часу змянення меркавання людзей. І, на мой погляд, вельмі важнае пытанне «Наколькі вы задаволены жыццём, якое ведзяце?» — сказаў Сяргей Мусіенка. — Санкцыйны рэжым, выбіральна, у адносінах да Беларусі дзейнічае практычна 30 гадоў. Апошнім часам ён узмоцнены, важна зразумець, як людзі адчуваюць сябе пры санкцыйным рэжыме, развязаным супраць нас, супраць простых людзей Беларусі. Хачу падкрэсліць, калі раней санкцыі датычыліся кіраўніка дзяржавы, чыноўнікаў высокага ўзроўню, асобных прадпрыемстваў, то цяпер яны ўведзены супраць краіны: дзяцей, пенсіянераў і інвалідаў, прадпрыемстваў — усіх без выключэння. Татальны санкцыйны рэжым. Гадоў 10 таму нават узнікала думка, як людзі на Кубе жывуць пад санкцыямі. Цяпер мы гэта ведаем на сваім лёсе».

Згодна з сацдаследаваннем, задаволены сваім жыццём 33,7 працэнта беларусаў, хутчэй задаволены — 45 працэнтаў.

«Вось гэта задаволенасць жыццём, на мой погляд, вельмі сур'ёзнае пытанне. Хацелася даведацца, як людзі сябе адчуваюць. Атрымліваецца, што больш за 78 працэнтаў задаволены і хутчэй задаволены сваім жыццём. А гэта ж мае шматфактарны характар. Гэта не толькі матэрыяльнае становішча, але і духоўнае, акружэнне, тая сітуацыя, у якой чалавек знаходзіцца. Гэта цудоўны адказ і высокая ацэнка дзейнасці Прэзідэнта, урада, Адміністрацыі Прэзідэнта, усяго дзяржаўнага апарату, — адзначыў кіраўнік Аналітычнага цэнтра ЕсооМ. — Таму што, на шчасце, мы не адчулі тых наступстваў, якія былі нам падрыхтаваны. Згадзіцеся, санкцыі былі ўведзены супраць нас, грамадзян Беларусі, для таго, каб пагоршыць наша становішча. Але дзякуючы правільным дзеянням улады мы гэтыя наступствы не адчуваем у поўнай меры, у той, якой маглі б адчуваць, па задуме тых, хто іх увёў. Тут вялікая размова аб тым, што мы рыхтаваліся. Гэта і імпартазамяшчэнне, і тая наша сельскагаспадарчая, перапрацоўчая палітыка, палітыка работы з Кітаем і Расіяй. Усё дало свой плён, і людзі яго бачаць. І ў гэтым рэжыме жорсткіх санкцый людзі адчуваюць абарону і спакой. Гэты адказ сведчыць шмат аб чым».

Не змаглі адказаць 7,7 працэнта, няма адказу ў 0,3 працэнта рэспандэнтаў.

«Гэта нармальная гісторыя, калі чалавек задумваецца. Можа, гэта нагода задумацца па-сапраўднаму і адказаць на штосьці для сябе. Гэта невысокі працэнт, паверце. І нармальная практыка, што ў гэты момант чалавек дакладна не вызначыўся і не можа адказаць. Гэта таксама шмат аб чым сведчыць. Няма жорсткай незадаволенасці і хутчэй незадаволенасці. Заўважце, гэта 4,6 працэнта і 8,7 працэнта адпаведна — толькі каля 13 працэнтаў», — удакладніў Сяргей Мусіенка.

Рэспандэнтам таксама прапанавалі ацаніць матэрыяльнае становішча сваёй сям'і. У выніку: 17,6 працэнта беларусаў ацанілі яго як добрае, 18,5 працэнта — як хутчэй добрае, 51,2 працэнта — як сярэдняе. Дрэнная — так адказалі 3,5 працэнта, хутчэй дрэнная — 6,2 працэнта, не змаглі адказаць толькі тры працэнты рэспандэнтаў.

«Адказы ў тым жа ключы рэжыму санкцый, супраціўлення той агрэсіі, якая супраць нас праводзіцца. І людзі не адчуваюць пагаршэння свайго матэрыяльнага становішча. Згадзіцеся, гэта таксама вельмі важна. Звярніце ўвагу, «не магу адказаць» — даволі мала. Таму што людзі дакладна разумеюць сваё матэрыяльнае становішча. У нас няма ў грамадстве такога жорсткага расслаення, як на Захадзе або ў суседзяў, на багатых і бедных. Мы вытрымліваем усе крытэрыі сацыяльнага грамадства, якое па матэрыяльным становішчы даволі добры стан дэманструе. Сярэдняе матэрыяльнае становішча, аб якім сказалі больш за 50 працэнтаў рэспандэнтаў, таксама вельмі паказальна. Гэта значыць, дастойна, нармальна жывуць у адпаведнасці з тымі магчымасцямі, якія ёсць у чалавека ў першую чаргу і ў дзяржавы, якая забяспечвае яго, гарантуючы бяспеку і магчымасці доступу да газу, цяпла і электрычнасці, — падкрэсліў кіраўнік Аналітычнага цэнтра ЕсооМ. — Вы ведаеце, новыя жыроўкі некаторым прыйшлі ў Берліне пасля 15 жніўня. Звычайная кватэра 40 кв. м — 635 еўра (толькі камунальныя плацяжы). І што людзі ў гэты момант могуць сказаць аб сваім матэрыяльным становішчы? Працаваць, каб абагрэцца? А гэта толькі камунальная плата, а калі яшчэ кватэра ў арэндзе? На Захадзе наогул вельмі малая доля людзей валодае кватэрамі. А зарплата там не тое што не павышаецца, але нават паніжаецца. Беспрацоўе расце. Дык гэта яшчэ зімы няма. Гэта не ацэнпяльны сезон, а проста гарачая вада ў жніўні. І гэта паўсюдна адбываецца ў Еўропе. Санкцыі супраць нас, Расіі прыводзяць да таго, што гэта адбіваецца на матэрыяльным становішчы канкрэтнага чалавека. Таму тое, як адказваюць беларусы, — дастойная ацэнка органаў улады і кіравання. Мы ўваходзім у ацэнпяльны сезон з іншымі адчуваннямі».

Яшчэ адно пытанне, зададзенае рэспандэнтам: «У якім напрамку, на вашу думку, цяпер развіваюцца падзеі ў Беларусі?»

32,4 працэнта беларусаў лічаць, што мы развіваемся ў правільным напрамку. 28,6 працэнта — хутчэй у правільным, 2,9 працэнта — у няправільным напрамку, 3,3 працэнта — хутчэй у няправільным, наколькі ў правільным, настолькі і не, — 9,4 працэнта. Не змаглі адказаць 22,5 працэнта, няма адказу — у 0,9 працэнта.

«Той складаны час, у якім мы цяпер знаходзімся, у сувязі з тым, што адбываецца ва Украіне, наогул у свеце, — гэта і навіны па Тайваню, аб эканамічнай сітуацыі ў ЗША... Тут, вядома, ідзе вялікая доля няпэўнасці думак аб будучыні. І мы бачым, што не змаглі адказаць 22,5 працэнта — гэта адлюстраванне той няпэўнасці, якая існуе ў свеце. Таму развіццё падзей у Беларусі вельмі залежыць ад адчування і развіцця падзей у свеце, не толькі ў Еўропе. І такая высокая ацэнка — звыш 60 працэнтаў — аб правільным і хутчэй правільным напрамку сведчыць аб тым, што наша дзяржава вытрымлівае свой курс і знаходзіць баланс. І, згадзіцеся, гэта адлюстраванне рэальнасці. Мы гэтыя паўгода пражылі на стужках падзей навін, якія адбываюцца ў суседзяў, перажываючы за іх. Але гэта ўсё пацвярджэнне таго, што мы паводзілі сябе правільна. І гэта дарагога варта. Мы вялі правільную палітыку, якая адлюстроўвае інтарэсы большасці насельніцтва, — дапоўніў Сяргей Мусіенка. — Адказ «наколькі ў правільным, настолькі і не» — 9,4 працэнта. Заўсёды ёсць доля людзей, якія ацэньваюць, што, можа, лепш так, потым яны пераконваюцца ў адваротным. Заўважце, ацэнка «няправільная» і «хутчэй няправільная» — па тры працэнты. Гэта гісторыя пра тое: а маглі б вось так. Вядома, тут цікава пагаварыць індывідуальна, што такое ў іх разуменні правільна. Тут таксама могуць быць розныя адказы. Але пераважная большасць насельніцтва лічыць у цэлым дзяржаўную палітыку правільнай».

«Мы бачым, як усюды ва ўсім свеце і ў той жа Еўропе ацэньваюць людзі сваю пазіцыю да падзей, якія адбываюцца. Прычым на самых розных узроўнях, у тым ліку высокіх. Чарада адставак урада, падзенне рэйтынгаў прадстаўнікоў улады ў Еўропе. Ужо больш за шэсць прэм'ер-міністраў, прэзідэнтаў заменены за гэты час або рыхтуюцца да адстаўкі. Гэта таксама шмат аб чым сведчыць. Мы неяк хутка забылі пра сусветныя лакдаўны. І адказы беларусаў — высокая ацэнка той дзейнасці, якую мы за апошні час вялі, — канстатаваў Сяргей Мусіенка. — Ведаеце, паводле ацэнак нямецкіх спецыялістаў, больш за 30 працэнтаў жыхароў Германіі знаходзяцца ў вельмі складаным псіхалагічным, нестабільным стане. Нават ім неабходна ўжо медыкаментозная дапамога, а не проста псіхалагічная. Таму што людзі сутыкнуліся з сур'ёзным выклікам. Мы бачым, што ў нас рэакцыя на выклікі даволі спакойная. Гэта адлюстраванне той рэальнасці, якая існуе. Безумоўна, нам вельмі гэта цікава. Па сутнасці, мы ўпершыню такое сацдаследаванне дзякуючы БелТА правялі і можам параўнаць з той сітуацыяй, якая была раней».

У перыяд з 22 ліпеня да 12 жніўня 2022 года па заказе БелТА Аналітычным цэнтрам ЕсооМ праведзена сацыялагічнае даследаванне «Сацыяльнае мысленне пад санкцыйным рэжымам». Апытана 1560 рэспандэнтаў у населеных пунктах усіх рэгіёнаў Беларусі з выкананнем прынцыпу рэпрэзентатыўнасці для насельніцтва Беларусі ад 18 гадоў па палавой прыкмеце, узросце, занятасці, тыпе населенага пункта і рэгіёне пражывання рэспандэнтаў. Статыстычная памылка выбаркі не перавышае 2,5 працэнта.

АЦАНІЦЕ МАТЭРЫЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА ВАШАЙ СЯМ'І



У ЯКІМ КІРУНКУ, ПА ВАШЫМ МЕРКАВАННІ, У ЦЯПЕРАШНІ ЧАС РАЗВІВАЮЦЦА ПАДЗЕІ Ў БЕЛАРУСІ?

НАКОЛЬКІ ВЫ ЗАДАВОЛЕНЫ ЖЫЦЦЁМ, ЯКОЕ ВЕДЗЯЦЕ?

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Цэны на газ у Еўропе пераадолелі адзнаку ў $3000 за тысячу кубаметраў

Цана прыроднага газу на лонданскай біржы ICE 22 жніўня пераваліла за адзнаку $3000 за тысячу кубаметраў. Цана на вераснёўскі ф'ючарс на нідэрландскім хабе TTF вырасла да $3034 за тысячу кубоў. Апошні раз паліва таргавалася вышэй за адзнаку ў $3000 у сакавіку гэтага года.

Кошт прыроднага газу пачаў павышацца ў панядзелак на фоне паведамленняў «Газпрама» аб плановым трохдзённым рамонце адзінай працуючай турбіны на газаправодзе «Паўночны паток-1». Трубаправод сыдзе ў прастой з 31 жніўня да 2 верасня.

Да гэтага кампанія прагназавала, што ў выпадку далейшых скарачэнняў паставак газу, затрымак з вяртаннем другой турбіны, якая была на рамонце ў Канадзе і цяпер знаходзіцца ў Германіі, цана на паліва можа перавысіць $4000 за тысячу кубаметраў да канца 2022 года.

NBC: большасць амерыканцаў лічыць, што краіна рухаецца ў няправільным кірунку

Амаль тры чвэрці амерыканцаў лічаць, што ЗША рухаюцца не ў тым напрамку, сведчаць вынікі апытання тэлекампаніі NBC.

Такім чынам выказаліся 74 працэнты апытаных. Гэты паказчык перавышае 70 % пяты раз запар, звярнулі ўвагу на тэлеканале.

На думку 58 % рэспандэнтаў, самыя лепшыя часы для Злучаных Штатаў ужо мінулі. Як мяркуюць 68 % апытаных, у эканоміцы назіраецца рэцэсія.

Станам спраў у краіне незадаволены шэсць з дзевяці апытаных. Як заявіў 61 % удзельнікаў апытання, кожны з іх гатовы «насіць пратэсны плакат хоць увесь дзень».

Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн атрымаў падтрымку сваёй дзейнасці з боку ўсяго 42 % рэспандэнтаў.

У Кітаі жаніх атрымаў 42 кг манет у якасці вясельнага падарунка ад найлепшых сяброў

У Кітаі сябры жаніха падарылі яму на вяселле 42 кг манет, піша Asia One. Па словах прыяцеляў, такім чынам яны хацелі пажартаваць з яго.

Сярод тых, хто падарыў манеты, была жанчына па прозвішчы Фей. Яна расказала, што для рэалізацыі ідэі ёй і сябрам прыйшлося абысці мноства магазінаў, каб размяняць банкноты.

«Гэта павінна было зрабіць вяселле больш жывым», — пракаментавала кітаянка.

Па словах сяброў, падараныя манеты — кішэнныя грошы жаніха пасля вяселля. У Кітаі існуе традыцыя, паводле якой жонкі распараджаюцца заробкамі мужоў.

«Таму нам і прыйшла ў галаву такая ідэя, каб у жаніха былі сродкі на ўласныя выдаткі», — прадоўжыла Фей.

Калі ж кадры з падоранымі манетамі завіруслісяся ў кітайскіх сацсетках, людзі сталі перажываць за таго, хто будзе лічыць гэтую «драбязу». «Жаніх з нявестай павінны самі ўсё пералічыць. Інакш які-небудзь рахункавод проста звар'яцее», — пажартавалі каментатары.

КАРЫСНА ДЛЯ ПЕЧЫВА, РАСЛІН І ЖЫВЁЛ...

Дражджавая прадукцыя сталічнага камбіната заўсёды карыстаецца папулярнасцю

Прасаваныя, інстантныя, сушаныя, спіртавыя, турбаспіртавыя, вінныя... Разнавіднасцяў дражджэй на сталічным камбінаце, здаецца, не так і шмат, але ж вырабаў, якія можна атрымаць з іх дапамогай, — процьма. Гэта і разнастайнае печыва, і алкагольныя напоі, і ўгнаенне, і падкормка для жывёл, і касметалагічныя дабаўкі... Знаходзіць новыя і, галоўнае, цікавыя нішы для перспектыўнага развіцця — адна з пастаянных задач ААТ «Дражджавы камбінат», дзе штодня рупліва клапоцяцца, каб дрожджы раслі спорна, дружна ды на карысць. Штогод на прадпрыемстве вырабляюць каля 15 тысяч тон прадукцыі, практычна цалкам задавольваючы патрэбы айчыннага спажыўца, ды яшчэ і на экспарт застаецца.

Шырокі асартымент прадукцыі і яе высокая якасць дасягнуты дзякуючы новым тэхналрогіям і рэцэптуры.

За працэсамі аўтаматызаванай упакоўкі прадукцыі сочыць аператар Варвара ФІЛІМОНАВА.

Імгненны вынік і імклівы рух

Без людзей у прадпрыемства няма будучыні, **упэўнены генеральны дырэктар ААТ «Дражджавы камбінат» Леанід ГЛІНСКІ,** таму тут да кадраў ставяцца з клопатам. Пачынаючы з 2008 года прадпрыемства было ў цяжкім становішчы, на камбінаце працаваў антыкрызісны кіраўнік. Дзякуючы міравому пагадненню з крэдыторамі, выплаты дражджавога па даўгах растэрмінавалі на дзесяць гадоў, каб пазбегнуць банкруцтва. Пакрысе прадпрыемства ўстала на ногі, перажыўшы ў тым ліку з'яўленне ў 2017 годзе канкурэнта з нямецкімі інвестыцыямі і дэмпінгавымі цэнамі, успамінае дырэктар:

— Мы былі манапалістамі на рынку прасаваных дражджэй і не былі гатовыя да наяўнасці яшчэ аднаго гульца, аб'ёмы продажу зменшыліся ўдвая. Было цяжка, аднак справіліся. Дзякуючы аднаму з былых кіраўнікоў, Ігару Забаштанскаму, на прадпрыемстве з'явілася сушыльная лінія па вырабе сушаных спіртавых і вінных дражджэй, якія паспяхова экспартуюцца за межы краіны. Не падвялі і работнікі, што засталіся працаваць, нягледзячы на цяжкасці, і захавалі калектыў (на камбінаце — 112 работнікаў).

Цяпер на камбінаце скіраваны на павелічэнне аб'ёмаў выпуску прадукцыі, пашырэнне асартыменту і рух наперад. Прычым рух гэты імклівы, адпавядае часу, якога заўжды не хапае. Гэта пацвярджаюць і новыя прадукты камбіната.

Сярод навінак — турбаспіртавыя і турбавінныя дрожджы: прадукт, які дазваляе атрымаць вынік імгненна, хіба што не праз суткі.

— Актыўна набываюць спіртавыя дрожджы расіяне і вытворцы дыстылятараў, якія прадаюць свае апараты ў камплекце з нашым прадуктам. Цяпер пачынаецца час на набыццё вінных дражджэй, бо паспелі ягады і неўзабаве падыдзе вінаград. Аднак бяруць іх аматары, бо прафесіяналы ўжо прывыклі да звыклай тэхналогіі «ягады-цукар-вада» і баяцца рызыкаваць.

А калі сур'ёзна, то сушаныя спіртавыя і вінныя дрожджы прадпрыемства ў вакуумнай упакоўцы вагой 100, 250 і 500 грамаў ужо чатыры гады як экспартуюцца ў Расію, ад Калінінграда да Сахаліна. Невялікія партыі (каля 6-7 тон штомесяц) набываюць у Смаленску і спіртавых прасаваных дражджэй. Пакрысе дэгустуюць і магчымасці турбапрадукту. Пры гэтым у прадпрыемства няма знешняй дэбіторскай запазычанасці, бо яно захавала палітыку работы па папярэдняй аплаце.

Генеральны дырэктар дражджавога камбіната нядаўна адзначыў 60-годдзе. Інжынер-механік па адукацыі (скончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі), ён двойчы за працоўную кар'еру на двух прадпрыемствах прайшоў усе ступені прафесійнай лесвіцы і ў перапынку паміж гэтым паспеў паспытаць хлеба чыноўніка, так што словы — быццам цяжкасцяў не баіцца, — не пусты гук.

Спачатку шчыраваў на «Валожынскай сельгастэхніцы», якую пасля перайменавалі ў «Валожынскую райаграпрамтэхніку», дзе ад інжынера-тэхнолага дайшоў да дырэктара. Пасля стаў першым намеснікам старшыні Валожынскага райвыканкама па сельскай гаспадарцы, дзе шмат чаму навучыўся, як кажа сам кіраўнік. «Работа там хоць і цяжкая, але ж жывая — штодня ў гаспадарках. Тры гады не быў у водпуску. Там у мяне быў суцэльны панядзелак. Участак работы вялікі, было напружана, але цікава. Аддаў рабоце гэтай колькі мог, назапасіў ведаў і ў 2014-м прыйшоў на камбінат». Пасля высокай пасады на дражджавым пачынаў ізноў практычна з нуля — ад вядучага інжынера да дырэктара ў 2020-м.

Кіраванне складаным тэхналагічным абсталяванем даверана сушыльшчыку Яўгенію НАВУМЧЫКУ.

Для малака, мяса...

Дрожджы з прабіётыкамі для харчавання жывёлы — таксама новы і вельмі цікавы кірунак развіцця камбіната, яны цяпер якраз праходзяць выпрабаванне ў сельскай гаспадарцы, дзе імі ласуюцца буйныя рагатыя жывёлы, падзяліўся Леанід Глінскі:

— Першая частка выпрабаванняў завершыцца ў канцы жніўня. Пасля пачнецца 9-месячны цыкл, калі вучоныя будуць правяраць, як вітаміны, бялкі і іншыя карысныя элементы, якія рагулі атрымалі з новага прадукту, адаб'юцца на смаку і якасці мяса ды малака.

... ды булак

Яшчэ адна цікавінка камбіната — інстантныя (хуткадзейныя) дрожджы «Скарапёк». Інавацыйнаму прадукту не патрэбная папярэдняя падрыхтоўка (гаспадыні ведаюць, што звычайныя дрожджы трэба развесці ды даць ім настаяцца, пасля цеста павінна не адну гадзіну пастаяць, каб падысці). А «Скарапёк» дадаюць проста адразу ў цеста, якое падымаецца за 28–35 хвілін.

Калараду — не па зубах, ружам — на квяцістасць

Адзін з вырабаў дражджавога камбіната, які даўно заваяваў прыхільнасць агароднікаў ды садаводаў Беларусі і Расіі, — экалагічны, бяспечны і натуральны біярэгулятар і стымулятар жыццядзейнасці раслін «Ростмамент». Прадпрыемствам і звычайным беларусам прыходзіцца проста паляваць на яго, настолькі хутка ён разыходзіцца з продажу. І таму ёсць прычына. Усё, да чаго дадаецца падкормка, расце літаральна як на дражджах.

— Прэпаратам можна апрацоўваць усё, што расце на ўчастку: ад кветак і памідораў да яблынь і елак. Гэта ідэальная альтэрнатыва хімічным угнаенням і гною. Калі апрацаваць «Ростмаментам» бульбу, яе не паесць каларадскі жук, бо лісце стане настолькі моцным, што насякомыя не здолеюць яго пагрызці.

Стымулятар — таксама найперш экспартны тавар. З году ў год рэалізацыя на экспарт павялічваецца. Як паказаў вопыт, «Ростмамент» павышае і квяцістаць раслін, і ўрадлівасць, і памер ягад і пладоў. Ведаючы гэта на практыцы, гендырэктар без біярэгулятара ніводную сяўбу не пачынае. Кажа, што яблыні палівае растворам, а бульбе дык проста падсыпае, і ніякіх больш падкормак ёй не дадае — і ўсё расце.

Перш чым вынесці вердыкт, спецыялісты два гады сочаць, як угнаенне ўплывае на паддоследную расліннасць у пэўным клімаце і ўмовах. Выпрабаванне прэпаратам афіцыйна прайшло ўжо больш як 40 культур, і штогод у рэестр дадаецца па дзве новыя расліны, якія «зведалі смак» дражджавога ўгнаення.

Ірына СІДАРОК,
Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 100104781.

Вымярэнні праводзіць вядучы інжынер-хімік Віялета ЯРАШ.

АД ПРАБІРКІ ДА ПАЧКА

Дрожджы — жывыя арганізмы, якія спажываюць бялкі, цукры, вітаміны і мікраэлементы, — усё, як у чалавека. У лабараторыі прадпрыемства з маленькай клетачкі ў прабірцы дражджавы «эмбрыён» вырастае да «немаўляці», пасля чаго трапляе ў спецыяльныя чаны, дзе яшчэ падрастае каля сутак, набываючы пэўныя аб'ём і масу. Потым яно «дагадоўваецца» ў адмысловых апаратах на асноўнай вытворчасці, расказала **Іна ЛАДУЦЬКА, начальнік вытворчасці дражджавога камбіната:**

— У залежнасці ад патрэб пакупніка з прабіркі вырошчваем дрожджы з пэўнымі ўласцівасцямі: спіртавыя, вінныя ці хлебапякарныя. Каб атрымаць сушаныя дрожджы, іх змяшчаюць у экструдар, адкуль танюткімі дражджавымі ніцямі-«макаронінамі» яны прасоўваюцца па меры падсыхання па сушыльнай лініі, пакуль не пакажуць 6-8 %. Дробныя кавалачкі ідуць на фасоўку ў пачкі, а больш буйныя — дадаюць, напрыклад, у «Ростмамент».

Найчасцей ужывальны памер фасоўкі дражджэй — 250 грамаў, аднак па жаданні заказчыка зробяць пачкі і па 100 грамаў, і па 500, і па кілаграме, у вакуумнай упакоўцы або не.

На дражджавым камбінаце ўпэўненыя ў тым, што ўсё атрымаецца. І неабходная аўтаматызацыя працэсаў, і з'яўленне новых прадуктаў, і здзяйсненне задуманага, бо за кожным з супрацоўнікаў — сем'і, якія нельга падвесці. Кіраўнік прадпрыемства ўпэўнены, што людзі — скарб, які дапаможа стварыць залаты запас і камбінату.

Цэх чыстай культуры. Тут працуе малады аператар Аліна ДУБІЦКАЯ.

Блізкая ўлада

РАЗВІЦЦЁ ІНФРАСТРУКТУРЫ, ЗЯМЕЛЬНЫЯ І ЖЫЛЛЁВЫЯ ПЫТАННІ

Іван Крупко дапамог вырашыць шэраг надзённых пытанняў падчас прыёму грамадзян

Старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО правёў прамую тэлефонную лінію і прыём грамадзян у Нароўлі. Асноўныя праблемныя моманты зваротаў грамадзян датычыліся развіцця інфраструктуры населеных пунктаў, зямельных спрэчак, жылля, паведаміў карэспандэнт БелТА.

Больш за тры гады не можа вырашыць зямельнае пытанне жыхарка Гомеля. У гараджанкі ёсць дачны ўчастак у Калініне Гомельскага раёна. Паводле слоў жанчыны, суседская лазня стаіць якраз на мяжы ўчасткаў, і яшчэ да 1 чэрвеня будынак не быў зарэгістраваны. «Агароджа сетка-рабіца — на нашай зямлі. Цэмент для металічных слупоў заліты на маёй зямлі», — апісала сітуацыю гамяльчанка.

«Створым камісію, разбяромся па кожным пункце, спецыялісты прапрацуюць і дадуць заключэнне», — сказаў Іван Крупко.

Інвалід-калясачнік з Азарычаў Калінкавіцкага раёна паскардзіўся, што ў гарадскім пасёлку адсутнічаюць пандусы на сацыяльна важных аб'ектах. «Звяртаюся ў розныя інстанцыі, але пытанне не вырашаецца», — удакладніў заяўнік.

«Акрамя таго, я пазбаўлены магчымасці паездкі ў раён. Рэйсавыя аўтобусы, якія праходзяць цераз Азарычы, не абсталяваны для пасадкі-высадкі інвалідаў. І каб трапіць, напрыклад, на абследаванне, а гэта за 42 кіламетры, даводзіцца наймаць машыну ў прыватнікаў — атрымліваецца Br40-50», — расказаў ён.

Як растлумачыў старшыня аблвыканкама, у наступным годзе гарадскі пасёлак чакаюць пераўтварэнні: «Выпрацоўваем комплексны план, дзе будуць улічаны і дарогі, і вуліцы, і інфраструктура, і іншыя аспекты. Прывядзём усё ў належны стан». Па пытанні транспарту тэму вывучаць сацыяльныя службы».

Шматдзетную сям'ю з Урыцкага Гомельскага раёна хвалюе жыллёвае пытанне. У тэлефонным званку галава сям'і растлумачыў, што для рэканструкцыі існуючага дома зрабілі праект. Па праекце частку дома дэмантавалі. «Засталося толькі 39 кв. м — кухня і адзін жылы пакой. Нас пяцёра чалавек. Хочам стаць на чаргу па паляпшэнні жыллёвых умоў і скарыстацца сямейным капіталам, але ў гэтым нам адмаўляюць», — апісаў стан спраў мужчына. У нюансах сітуацыі будзе разбірацца камісія, у якую ўвойдуць спецыялісты розных службаў.

Жыхары шматкватэрнага кааператыўнага дома ў Нароўлі на прыёме агучылі сваю праблему: дах увесь гнілы, цячэ, на чарзе на рамонт дом не стаіць.

Губернатар паставіў задачу ўладам раёна — стварыць камісію, прайсці па кожнай кватэры і заключыць дагаворы аб матэрыяльным удзеле жыльцоў (прапарцыянальна існуючым ва ўласнасці ў іх квадратным метрам) у рамонце з растэрміноўкай пакрыцця сродкаў на год. Як толькі будуць падпісаны дагаворы, пачнуць бягучы рамонт. Жыльцоў хвалюе і пытанне, куды пайшлі грошы, якія яны адлічвалі з моманту ўводу дома. Старшыня аблвыканкама адзначыў: неабходна правесці пракурорскую праверку па рабоце кіраўніцтва кааператыва.

Шэраг пытанняў аб сацыяльна-эканамічным развіцці раёна ўзняў пенсіянер з Нароўлі. Так, жыхара райцэнтра цікавіць тэма замацавання маладых спецыялістаў у Нараўлянскім раёне, функцыянавання сельгаспрадпрыемстваў, добраўпарадкавання і многія іншыя.

Звароты заяўнікаў узялі на кантроль.

ПАРАДЫ ДЛЯ ЛІЧБАВАЙ ГІГІЕНЫ

ГЕАЛАКАЦЫЯ СОЧЫЦЬ ЗА ТАБОЙ!

Існуюць простыя і дзейсныя механізмы аховы, якія па сілах выконваць кожнаму, упэўненыя ў Цэнтры.

Найперш, не трэба ўказваць пра сябе празмерна шмат асабістай інфармацыі, накшталт месца жыхарства, асабістага нумара мабільнага тэлефона, метак геалакацыі на фотаздымках.

Неабходна вытрымліваць сеткавую гігіену, то-бок выкарыстоўваць ліцэнзійнае праграмнае забеспячэнне і антывірусы, а таксама прыдумваць складаныя паролі.

Калі вы афармляеце чарговую картку на зніжкі ў краме ці рэгіструецеся на нейкім сайце, варта вывучыць палітыку канфідэнцыяльнасці адпаведнай арганізацыі. Не лішнім будзе і пачытаць пра свае правы, якія даюцца Законам аб ахове персанальных даных, каб ведаць, як іх рэалізоўваць на практыцы, параіла **Вольга ШЫБКО, намеснік начальніка ўпраўлення адукацыйных паслуг і сувязяў з грамадскасцю НЦАПД:**

— Часта людзі ўказваюць на здымках месцы, дзе гэтыя фота былі зробленыя. Аднак мала хто задумваецца, што па метцы геалакацыі на фотакартцы, зробленай па месцы жыхарства чалавека, можна высветліць дом, дзе жыве асоба, якая апублікавала фота ў сеціве. А ці заўважалі вы, што калі карыстаецеся сацсеткамі, знаходзячыся ў пэўным раёне горада, да вас на тэлефон прыходзіць кантэкставая рэклама, якая дэманструе найбліжэйшыя ад вас рэстараны, салоны прыгажосці і іншыя ўстановы? Гэта не супадзенне, а вынік збору вашых даных навігацыі ў інтэрнэце і геалакацыі.

Адключаць функцыю вызначэння месцазнаходжання ў сваім браўзеры і мабільным тэлефоне. Карыстацца ёю варта толькі пры неабходнасці, калі трэба некуды дабрацца.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

КОПІЯ ПАШПАРТА: НЕАБХОДНАСЦЬ ЦІ НЕ

Пашпарт грамадзяніна — дакумент, што пацвярджае асобу чалавека. Персанальныя даныя, якія ён утрымлівае, — важныя і канфідэнцыяльныя звесткі. Тое ж самае датычыцца і копіі пашпартных даных, якія чалавека часта просяць прадставіць. Прасіць прад'явіць дакумент, які пацвярджае вашу асобу, — гэта адно, а патрабаваць копію пашпарта і захоўваць яе — зусім іншае. У шэрагу выпадкаў копія проста непатрэбная.

— Копію пашпарта могуць папрасіць у банку для набыцця крэдыту, падчас нейкіх працэдур у падатковых органах, афармленні візы, пастаноўкі на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Ва ўсіх гэтых выпадках з прававога пункту гледжання прад'яўленне копіі пашпарта апраўданае, — заўважыла спецыяліст.

Недапушчальна прасіць копію пашпарта пры працаўладкаванні, пры аказанні (атрыманні) паслуг, вяртанні тавару, для пацвярджэння асобы. Ва ўсіх гэтых выпадках дастаткова прад'явіць (проста паказаць) пашпарт.

— Адсылаючы фота свайго дакумента, напрыклад, для аднаўлення доступу да старонак у сацыяльных сетках, трэба быць уважлівымі. Складана прадугледзець, дзе апынецца фота вашага пашпарта і як вашы персанальныя даныя будуць абароненыя, — падкрэсліла Вольга Шыбко. — Асобы, якія займаюцца зборам пашпартных даных, павінны гарантаваць іх бяспечную апрацоўку і ахову, у тым ліку недапушчальнасць іх траплянне ў рукі трэціх асоб (акрамя выпадкаў, калі тое дапускаецца заканадаўствам).

Перш чым аддаваць копію свайго пашпарта ці пагаджацца на тое, каб яе зрабілі, высветліце, якой нормай закона кіруецца асоба, зацікаўленая ў зборы такой інфармацыі і якая просіць яе ў вас.

ФІЛЬТРУЙЦЕ НАСТРОЙКІ ПРЫВАТНАСЦІ

Ствараючы ў сацыяльных сетках адкрыты профіль і публікуючы ў ім свае імя, прозвішча і імя па бацьку, мы самі робім свае персанальныя звесткі агульнадаступнымі. Сцерці інфармацыю пра сябе з сацсетак можна, толькі выдаліўшы акаўнт. Аднак нават пасля таго вашы даныя нейкі час яшчэ будуць захоўвацца ў data-цэнтры, папярэдзілі ў НЦАПД.

— Сацыяльныя сеткі збіраюць мноства інфармацыі не толькі з вашага профілю, а таксама звесткі пра вашы дзеянні ў сеціве: пераходы па старонках, лайкі, рэпосты, — растлумачыла Вольга Шыбко. — Ствараючы профіль у сацсетцы, карыстальнік прымае пагадненне аб канфедыцыяльнасці, часта нават не чытаючы яго. А яшчэ — пакідае настройкі прыватнасці, якія ўстаноўлены па ўмаўчанні. Гэта спрыяе таму, што сацыяльныя сэрвісы гадамі назапашваюць мноства даных, якія датычацца канкрэтнага чалавека. Вось і атрымліваецца, што сістэма часам ведае пра асобу больш, чым яе сваякі і сябры.

Спецыялісты Цэнтра раяць аддаць увагу настройкам прыватнасці профілю пры рэгістрацыі ў сацсетках, а таксама выдаліць частку інфармацыі, якая была раней змешчана на вашых старонках. Варта памятаць: не публікуйце ў сацсетцы тое, што не гатовыя расказаць незнаёмым.

1,5 МІЛЬЁНА НЕЗАКОННЫХ ЗВЕСТАК

Закон аб ахове персанальных даных запрацаваў дзевяць месяцаў таму. Літаральна днямі ён быў перакладзены на англійскую мову і змешчаны на англамоўнай версіі сайта https://cpd.by/en/glavnaya-english/. Выконваючы юрыдычны пераклад, эксперты асабліваю ўвагу ўдзялілі правільнай і дакладнай падачы нарматыўнага прававога акта, што вельмі важна для адзінства яго разумення і трактавання, падкрэслілі ў Цэнтры.

— Пераклад, несумненна, будзе садзейнічаць прыцягненню ўвагі замежнай аўдыторыі да ствараемых у Беларусі ўмоў па ахове персанальных даных людзей, а таксама развіццю супрацоўніцтва нашага Цэнтра з органамі і арганізацыямі па ахове правоў суб'ектаў персанальных даных у замежных дзяржавах, — упэўнены **дырэктар НЦАПД Андрэй ГАЕЎ.** — З улікам ведання юрыдычных сістэм, умення аперыраваць нарматыўнымі фармулёўкамі на практыцы, эксперты пастаянна ўзаемадзейнічаюць з аналагічнымі нашаму Цэнтру органамі ў іншых краінах, і перапіска часта вядзецца на англійскай мове. На замежнай мове за час існавання Цэнтра прыйшлося неаднаразова накіроўваць і патрабаванні ўладальнікам сацыяльных сетак і сайтаў аб выдаленні з іх рэсурсаў незаконна апублікаванай інфармацыі пра беларускіх грамадзян.

Ірына СІДАРОК.

✓ За няпоўны год існавання НЦАПД дзякуючы яго рабоце з інтэрнэту было выдалена больш як 1,5 мільёна запісаў з незаконна распаўсюджанымі персанальнымі данымі беларусаў.

✓ Кіраўніцтва і супрацоўнікі Цэнтра далі 600 тлумачэнняў і адказаў на пытанні грамадзян праз разгляд зваротаў, на асабістых прыёмах, праз «гарачыя лініі» і ў сацыяльных сетках.

✓ Падрыхтавана 30 пакрокавых інструкцый, рэкамендацый, алгарытмаў, шаблонаў і формаў дакументаў, неабходных для работы з персанальнымі данымі.

✓ 14 тысяч чалавек паўдзельнічала ў мерапрыемствах, якія ладзіць Цэнтр: семінарах, вэбінарах, адукацыйных анлайн-марафонах і практыкумах.

✓ Спецыялісты Цэнтра даследавалі 67 скаргаў пра парушэнне правоў грамадзян пры апрацоўцы персанальных даных і правялі 25 планавых, пазапланавых і камеральных праверак.

Надвор'е

Спякотна і суха

Спякотнае надвор'е захаваецца ў Беларусі да канца тыдня, паведамілі БелТА ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Дзякуючы вобласці павышанага атмасфернага ціску, сфарміраванай у вельмі цёплай паветранай масе трапічнага паходжання, у нашай краіне амаль увесь тыдзень будзе сонечна і без ападкаў, толькі ў пятніцу ў паўночных раёнах краіны лакальна могуць быць кароткія летнія дажджы. Тэмпература паветра ноччу не ніжэй чым плюс 13—20, днём спраўдная спёка: на тэрмометрах да плюс 27—34. Такі тэмпературны фон на 5—7 градусаў перавышае кліматычную норму.

У сераду, 24 жніўня, чакаецца без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 14—20, днём будзе 28—34.

У чацвер, 25 жніўня, прагназуецца без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы 13—20 градусаў цяпла. Днём паветра прагрэецца да плюс 28—34.

У пятніцу, 26 жніўня, будзе пераважна без ападкаў, толькі ў паўночных раёнах краіны месцамі магчымы кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 13—20. Днём чакаецца 27—34 градусы.

У суботу—нядзелю, 27-28 жніўня, прагназуецца пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 13—20 градусаў, днём 27—34.

Камунальныя стасункі

КАНДЫЦЫЯНЕР ПА ЎЗГАДНЕННІ

Што патрэбна, каб узгадніць установку кандыцыянера ці легалізаваць ужо зроблены і працуючы. Чаму лепш зрабіць гэта, а не чакаць штрафу? Як дзейнічаць, калі ва ўстаноўцы адмовілі, і дзе ўстанаўліваць такія прылады нельга? Адказы на ўсе гэтыя і іншыя пытанні ў пакрокавай інструкцыі даюць спецыялісты Міністэрства ЖКГ.

Калі вы задумалі разнастаіць інтэр'ер сваёй кватэры кандыцыянерам, неабходна атрымаць узгадненне тэрытарыяльнага падраздзялення архітэктуры і гарадабудаўніцтва згодна з Палажэннем аб умовах і парадку ўстаноўкі на дахах і фасадах шматкватэрных жылых дамоў індывідуальных антэн і іншых канструкцый. Для гэтага трэба звярнуцца ў адміністрацыю раёна.

Каб атрымаць узгадненне на ўстаноўку, патрэбны наступныя дакументы:

— заява на ўстаноўку кандыцыянера (яе бланк можна атрымаць у службе «адно акно» і ўпісаць туды свае даныя);

— тэхнічны пашпарт і дакумент, які пацвярджае права ўласнасці на памяшканне, калі вы ўласнік жылля;

— пашпарт ці іншы дакумент, які сведчыць асобу, або дакументы, якія пацвярджаюць паўнамоцтвы прадстаўніка грамадзяніна.

Сабраўшы ўсе дакументы, можна звяртацца па ўзгадненне ўстаноўкі кандыцыянера ў службу «Адно акно» адміністрацыі раёна, дзе тэрытарыяльна будзе знаходзіцца прылада. Працэдура ўзгаднення бясплатная, а заяўку павінны разгледзець за 15 дзён з дня падачы.

Узгадняць установку кандыцыянера неабходна па наступных прычынах:

— павінен вытрымлівацца эстэтычны выгляд дома (вонкавыя блокі кандыцыянераў мусяць устанаўлівацца ў пэўным парадку, адзін над адным);

— мантаж абсталявання не павінен сапсаваць фасад;

— кандэнсат ад кандыцыянера не можа капаць на галовы прахожых або цячы на вокны ці сцены суседзяў, каб не разбурацца адмостку і падмуркі.

Адмовіць ва ўзгадненні ўстаноўкі кандыцыянера могуць у наступных выпадках:

— грамадзянін прадставіў дакументы або звесткі, якія не адпавядаюць патрабаванням заканадаўства, у тым ліку падробленыя або нядзейсныя дакументы;

— у выніку ўстаноўкі кандыцыянера ўзнікне пагроза абвалявання канструкцый шматкватэрнага дома;

— дом унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі;

— будынак выходзіць на галоўныя вуліцы і плошчы, пералік якіх вызначаецца адміністрацыяй раёна.

Калі вам адмовілі ва ўзгадненні ўстаноўкі, рашэнне можна абскардзіць у вышэйшай інстанцыі ці судзе.

Пры станоўчым адказе можна выбіраць кандыцыянер і падрадную арганізацыю па яго ўстаноўцы. Лепш, калі продаж і мантаж робіць адна фірма — тады ўсе спрэчныя моманты можна адрасаваць адной асобе, раяць камунальнікі.

Самавольная ўстаноўка кандыцыянера забаронена — за гэта прадугледжаны штраф ад дзвюх да 15 базавых велічынь, нагадваюць спецыялісты. Аднак калі жыхар устанавіў кандыцыянер самавольна, а пасля сам жа вырашыў легалізаваць становішча прылады, то працэдура ўзгаднення для яго гэткая ж, як і перад устаноўкай кандыцыянера. Толькі адказ на свой запыт уладальнік кандыцыянера будзе чакаць не 15 дзён, а месяц з дня падачы дакументаў.

Важна памятаць, што, калі ўстаноўлены кандыцыянер адмовяцца ўзгадніць, уладальніку прылады прыйдзецца самастойна ці з дапамогай спецыялізаванай арганізацыі дэманціраваць яго ў адведзены тэрмін. Акрамя таго, жыхар павінен прывесці ў папярэдні стан фасад ці дах дома, дзе ён без дазволу ўстанавіў кандыцыянер.

Ірына СІДАРОК.

Судовая справа

Форс-мажор падчас паездкі

Маладая гродзенка стала ахвярай незвычайнага дарожнага здарэння. Што вырашыў суд?

Гэта драматычная гісторыя пачалася два гады таму, у канцы жніўня 2020 года. Амаль увесь гэты час ішоў судовы разбор.
Сама па сабе фабула здарэння здаецца неверагоднай. На гарадской вуліцы каля святлафора ўзрываецца кола грузавога аўтамабіля. Выбух настолькі моцны, што лопаецца шкло ў акне тралейбуса, які стаіць побач. Асколкі разлятаюцца па салоне, раняць некалькі чалавек, але больш за іншых — 25-гадовую Аліну (імя зменена).

Сітуацыя, шчыра скажам, нестандартная. І, магчыма, не мела б такога цеснага разгляду, калі б не сур'ёзныя наступствы для пасажыркі, жыццё якой кардынальна змянілася ў выніку паездкі.

— Раптоўна адчула рэзкі ўдар злева. Мяне развярнула і вынесла выбуховай хваляй на другое сядзенне. Я адчула моцны звон у вушах, нічога не бачыла. Схапілася за галаву і жахнулася, бо людзі ў тралейбусе закрычалі. А я ніяк не магу зразумець, што здарылася, ад шоку не магу самастойна выйсці з тралейбуса. Падумала, што ў тое месца, дзе сядзела, урэзалася фура. Кружылася галава, адчувала сябе, як у вакууме. Нейкі мужчына вынес мяне з тралейбуса і пасадзіў на траву. З тралейбуса прынеслі мае рэчы, у тым ліку тэлефон. У гэты час па твары цякла кроў. Людзі сказалі, што на твары асколкі шкла. Хтосьці выклікаў хуткую дапамогу, хтосьці выціраў кроў сурвэткамі, — расказала Аліна падчас суда.

Пад'ехала хуткая дапамога і забрала дзяўчыну ў бальніцу. У той момант ёй здалося, што ўсё цяжкае ўжо адбылося. Але аказалася, што гэта не так. У машыне яна не змагла расплюшчыць вочы. Хірург папярэдзіў, што будзе дзве аперацыі — спачатку зашыюць усе раны, а потым мікрахірургі зоймуцца вачыма.

Першая аперацыя доўжылася паўтары гадзіны, было зроблена звыш 20 швоў на твары, шыі і галаве. Другая аперацыя ішла яшчэ тры гадзіны. З вока дасталі асколак, якім выбіла частку радужнай абалонкі. Ніхто не даваў станоўчых прагнозаў адносна захавання зроку на траўмаваным воку.

У такім становішчы дзяўчына сустрэла сваё 25-ігоддзе, якое планавала адзначыць у Санкт-Пецярбургу. Грошы, сабраныя на паездку, пайшлі на лячэнне. Аперацыю па замене хрусталіка, пластыку радужнай абалонкі ёй рабілі ў платнай клініцы ў Мінску. Гэта была чацвёртая па ліку аперацыя. На месцы лазернай карэкцыі рубцоў з'явіліся ярка-чырвоныя шрамы. Але самым сур'ёзным наступствам стала поўная страта зроку на левым воку.

Праз некалькі месяцаў Аліне афармілі пенсію па інваліднасці — далі трэцюю групу без устанаўлення працэнта непрацаздольнасці. Хоць тое неабходна для атрымання страхавых выплат.

Дзяўчына пераехала ў прыгарад да бацькоў, змяніла работу. Яна прызналася, што ад бясконцых паходаў у паліклініку, аналізаў, аперацый вельмі стамілася, згубіла прагу да жыцця. Прыходзіцца вучыцца жыць па-новаму, пераадольваць не толькі фізічныя пакуты, але і маральныя. Да болі далучаўся і выгляд пакалечанага твару, страта зроку, з чым прыйдзецца мірыцца ўсё жыццё. Асаблівы жах выклікаюць паездкі ў грамадскім транспарце.

Аліна звярнулася ў суд па кампенсацыю як маральнай, так і матэрыяльнай шкоды.

Як паясніла суддзя Наталля Шышко, згодна з Пастановай Пленума Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь ад 28.09.2000 года, маральная шкода падлягае кампенсацыі ва ўсіх выпадках, калі дзеянні парушаюць асабістыя правы грамадзяніна альбо маюць на іх замах. У адпаведнасці з артыкулам 152 ГК Рэспублікі Беларусь грамадзянін мае права патрабаваць ад парушальніка грашовую кампенсацыю названай шкоды.

Кампенсацыя маральнай шкоды здзяйсняецца незалежна ад віны таго, хто нанёс гэту шкоду, у выпадках калі шкода прычынена выключна альбо здароўю грамадзяніна крыніцай павышанай бяспекі.

Юрыдычныя асобы і грамадзяне, дзейнасць якіх звязана з павышанай бяспекай для навакольных (выкарыстанне транспартных сродкаў, механізмаў, электрычнай энергіі, выбуховых рэчаў, моцных ядаў, будаўнічая дзейнасць і іншае) абавязаны кампенсаваць шкоду, нанесеную крыніцай павышанай бяспекі, калі будзе даказана, што шкода ўзнікла з прычыны непераадольнай сілы (арт. 948 ГК РБ).

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Прасцей кажучы, той, хто адказны за небяспечны механізм, павінен адказаць за шкоду, якую гэты механізм нанёс.

Дзяўчына заявіла памер кампенсацыі за маральную шкоду ў суме 30 тысяч рублёў. А таксама 4 тысячы 171 рубель за медыцынскія паслугі. Пазней Аліна павялічыла памер кампенсацыі да 50 тысяч рублёў. Іск быў адрасаваны кіроўцу МАЗа і тралейбуснаму ўпраўленню.

Дзяржінспекцыя правяла праверку, у ходзе якой было ўстаноўлена, што выбух адбыўся з-за разгерметызацыі вонкавага кола МАЗа. Па выніках праверкі была распачата крымінальная справа. Падазраваным прызнаны кіроўца. Але праз паўгода следства прыпынілі ў сувязі з адсутнасцю саставу злачынства. Устанавіць асобу, якая падлягае прыцягненню ў якасці абвінавачанага, у дадзеным выпадку не ўяўлялася магчымым, бо здарэнне не можа быць кваліфікавана як дарожна-транспартнае.

А між тым разгляд судовай справы Аліны працягваўся. Дзяўчына расказала, што праз месяц у яе скончыліся грошы, а бальнічны падаўжаўся.

Суд палічыў неабходным прыцягнуць да судовай справы і страхавыя кампаніі.

У адпаведнасці з Грамадзянскапрацэсуальным кодэксам дапускаецца працэсуальнае саўдзельніцтва, па якім іск можа быць прад'яўлены да некалькіх адказчыкаў. Паколькі ісцец атрымала траўму ў выніку няшчаснага выпадку падчас паездкі ў грамадскім транспарце, а Гродзенскім тралейбусным упраўленнем заключаны дагавор абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці перавозчыка перад пасажырамі, страхавыя кампаніі варта прыцягнуць да ўдзелу ў дадзенай справе ў якасці суадказчыка, — пракаментавала сітуацыю Наталля Шышко.

Страхавыя кампаніі абодвух транспартных сродкаў выплацілі Аліне ў агульнай суме 13,2 тысячы рублёў. У страхавой кампаніі пералічылі ўсе лекавыя сродкі, якія падлягаюць выплатам згодна з іх выкарыстаннем. Усяго атрымалася больш за 10 найменняў. Яшчэ 286 рублёў выдаткавана на лазерную аперацыю, 1450 рублёў — на імпланты. У спіс не ўвайшло тое, што не пацверджана дакументальна. Улічваўся і той факт, што пацярпелая выбірала медустанову сама, а не была туды накіравана. У гэтым выпадку выплаты не вяліся.

Што датычыцца кіроўцы грузавіка, ён прызнаў іск часткова. Патрабаванні аб кампенсацыі матэрыяльнай шкоды не прызнаў, бо лічыць, што гэтыя страты кампенсуюць страхавыя выплаты. У судзе выступіў з просьбай зменшыць памеры іску са спасылкай на матэрыяльнае становішча, наяўнасць непаўналетніх дзяцей і аказаную раней дапамогу. Кіроўца настойваў на тым, што яго віны ў здарэнні няма.

Суд задаволіў іск Аліны часткова. З кіроўцы на кампенсацыю маральнай школы вырашана спагнаць 30 тысяч рублёў плюс часткова затраты на медыцынскія паслугі і юрыдычную дапамогу. Агульная сума склала 31 130 рублёў.

А вось тралейбусны парк, згодна з рашэннем суда, не можа быць прыцягнуты да адказнасці, таму і кампенсацыі плаціць не павінен. Справа ў тым, што здарэнне не прызнана дарожна-транспартным, а кваліфікуецца як няшчасны выпадак.

Аб чым гэтая гісторыя? Магчыма, аб болі і хаджэнні па пакутах звычайнай гараджанкі, на месцы якой мог аказацца любы іншы. А яшчэ аб кіроўцах, чые транспартныя сродкі раптоўна становяцца небяспечнымі для навакольных. І гэта той форс-мажор, якога пры належнай эксплуатацыі аўтамабіля ўсё ж такі можна было пазбегнуць...

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

Меркаванне

УЗРОСТ — НЕ ПЕРАШКОДА?

Ці лёгка быць маладым? А пажылым?

Эйджызм, калі хто не ведае, — гэта грэблівае ці прадузятае стаўленне да людзей на падставе іх узросту. Часцей за ўсё гаворка ідзе аб пажылых людзях, але сустракаецца і эйджызм «наадварот», калі дыскрымінацыі падвяргаецца моладзь. Звычайна эйджызм згадваюць, калі сутыкаюцца з цяжкасцямі пры працаўладкаванні, але дадзеная з'ява закранае і многія іншыя сферы.

«ШТО ВЫ ХОЧАЦЕ Ў ВАШЫМ УЗРОСЦЕ»

Каронная фраза пасрэдных медыкаў. Гэты «ваш узрост» можа наступіць і ў 40, і ў 70 гадоў. Калі не хочацца думаць, як лепш лячыць чалавека, якія абследаванні прызначаць, тады прасцей згадаць узрост. Часам медыкі грашыць тым, што гавораць пацыенту аб кошце лекаў, маючы на ўвазе, што пенсіянеру яны не па кішэні. Ім нават у галаву не прыходзіць, што гэта абразліва. У кожнага чалавека свае жыццёвыя акалічнасці. У кагосьці добрая пенсія і ёсць збераженні, камусьці дапамагаюць дзеці, а іншы пры любым раскладзе аддасць прыярытэт здароўю.

Падліваюць масла ў агонь і свякі. «Адключаю яму газ, святло, перакрываю ваду, так ён і сядзіць. Але пару разоў неяк сцямію і ўключаў газ, нешта там сабе варыў, спаліў усе ронделі», — распавядала жанчына па тэлефоне. За паўгадзіны ў гарадской электрычцы я даведалася некаторыя абставіны яе жыцця — размовы ж не спыняліся. «У «дурку» свайго бацьку не павязу, няхай так дажывае. Ну, гэта ты сваю старую возіш на Бехцерава, а я ганьбіцца не буду», — горача камусьці даказвала пасажырка. Значыць, прасцей зачыніць бацьку ў кватэры без вады, без гарачай ежы, а прызнаць, што ёсць праблемы са здароўем, і паспрабаваць дапамагчы — гэта, аказваецца, сорамна.

З маладымі людзьмі па-іншаму. Лічыцца, што з-за ўзросту ў іх не можа быць сур'ёзных захворванняў, яны проста хочуць атрымаць бальнічны, а школьнікі і студэнты — вызваленне ад заняткаў. На жаль, хваробы маладзеюць, і ўжо не дзіва, калі, напрыклад, у аддзяленні рэўматалогіі можна ўбачыць пацыентаў ад 25 гадоў.

«БУДЗЕЦЕ ЯК САРАКАГОДКА»

Пакупніца гадоў 60 удакладняла ў прадаўца, ці ёсць яе памер плашча бірузовага колеру. «Жанчына, вазьміце сіні ці чорны, куды вам ужо бірузовы», — адказала работніца прылаўка. Адбыўся скандал. Выйшла загадчыца, перапытала, у чым праблема, і нават знайшла бірузовы плашч патрэбнага памеру ў іншай краме сеткі.

Зваротная гісторыя з дзяўчынай гадоў 25. Яна шукала офісны касцюм 44-га памеру. «Ой, ну вы ў ім будзеце, як саракагодка, маладыя дзяўчаты такое цяпер не носяць», — заявіла прадавец, якой на выгляд 40+.

«Можна, я сама вырашу, што мне насіць?» — адказала пакупніца. І гарнітур патрэбнага памеру і колеру знайшоўся.

А як жа быў здзіўлены юны кансультант, калі мужчына, відавочна старэйшы за 70 гадоў, запатрабаваў смартфон пэўнай маркі: «Вы сапраўды жадаеце гэтую мадэль? Хто вам параіў? Можа, парэкамендаваць нешта іншае?»

«А што, у вас заляжаліся кнопкавыя тэлефоны? — з'едліва спытаў мужчына. — Вы ж нам звычайна іх раіце».

У фірменнай краме жаночай бялізны прадаўцы ветліва абслугоўвалі пажылых іншаземак. А вось суайчынніца гадоў блізу 60, якая набыла дарагі камплект, выкліка-ла бурнае абмеркаванне. Маўляў, бабуля, а купіла раскошную бялізну: можа, ёй яшчэ і ёсць перад кім у ёй дэфіліраваць? Якіх толькі эпітэтаў не прыдумалі для «састарэлай фіфы».

Мяне ж прадавец сустракала каля прымерачнай: «Падышло?»

«Так, — адказала я, — але толькі нічога купляць у вас не буду роўна да таго моманту, пакуль вы не навучыцеся паважаць пакупнікоў усіх узростаў».

Не толькі нетактоўныя прадаўцы прыніжаюць людзей. Сваю лепту ўносіць і сям'я. «Буду я яшчэ грошы марнаваць на гэтага смаркача», — разважае маці. І ёй няўцям, колькі клінаў аднакласнікаў прыйшлося перажыць яе дзіцяці з-за старога і ўжо нямоднага ў падлеткавым асяроддзі адзення. Колькі сацыяльных сувязяў гэтага дзіцяці парушана і як гэта ўсё ада-б'ецца на яго дарослым жыцці.

«МЫ ЛЕПШ ВЕДАЕМ»

«Ты нічога не разумееш, навошта толькі паехала з намі», — шыпеў сын гадоў 50 на маці гадоў 75. А адбывалася тое ў мэблевай краме. Жанчына вельмі лагічна тлумачыла, чаму вялізная канапа — не найлепшы выбар для дачнага доміка. Яна ведала ўсе памеры пакоя, адлегласць ад воклаўдзвярэй. Але сын і нявестка стаялі на сваім: вось гэтая канапа — і кропка.

«Мы лепш ведаем, што табе трэба, мы жыццё пражылі», — звычайна так аргументуюць бацькі свой «клопат». Яны пазбаўляюць дзяцей права выбару: з кім сябраваць, якую прафесію абраць, з кім будаваць сям'ю. І пры гэтым упэўненыя, што «хочуць сваім дзецям толькі самага лепшага». А між тым, пазбаўляюць права прымаць самастойныя рашэнні і адказваць за сваё жыццё.

ЯК ПАЗБАВІЦЦА АД ЭЙДЖЫЗМУ

Нялёгка і няпроста. На заканадаўчым узроўні прапісана, што пры працаўладкаванні дыскрымінацыя па ўзросце забароненая. Але ж яна нікуды не дзелася, бо знаходзяць, як той казаў, дзіркі ў плоце. Так, цяпер у вакансіях не пішуць, што шукаюць работніка да 35 гадоў, затое адзначаюць, што «запрашаюць у маладыя калектыў» — а гэта відавочны бар'ер для старэйшых суіскальнікаў. Маладым таксама нялёгка знайсці работу, таму што «досведу няма», «сыдзе ў дэкрэт» і «яны шмат ведаюць аб сваіх правах».

Цяпер многа гавораць аб разрыве пакаленняў, калі каштоўнасці малодшага пакалення моцна адрозніваюцца ад культурных і іншых каштоўнасцяў старэйшага. Але як утварыўся гэты разрыў? Найперш з-за недахопу і павярхоўнасці зносін розных пакаленняў адной сям'і, нягібкасці старэйшых і адсутнасці цікавасці ў малодшых. Вечны пошук вінаватых, крайніх і сыход у глухую абарону. Але збліжае людзей нешта агульнае. Успомніце папулярны жарт: «Пакаленне, якое хадзіла без шапак, спарадзіла пакаленне, якое ходзіць без шкарпэтак». Ігнараванне галаўнога ўбору тымі, каму сёння 40—50 гадоў, і дэманстраванне голых шчыкалатак тымі, каму 20, — з'явы аднаго парадку. Прасцей кажучы, кожнае маладое пакаленне ў многім падобнае на папярэдняе, толькі сродкі самавыяўлення адрозныя: дзяды насіліся з транзістарамі, унукі носяцца са смартфонамі...

Маргарыта ДРАЗДОВА.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ЦЁПЛАЯ ВОСЕНЬ СА «ЗВЯЗДОЙ»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Цёплая восень са «Звяздой» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі тэрмін з 1 верасня 2022 года да 31 снежня 2022 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2022 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Цёплая восень са «Звяздой» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда», — і складаецца з наступных рэчаў:

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Цёплая восень са «Звяздой» складае: — 562,03 (пяцьсот шэсцьдзясят два) рублі тры капейкі.

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт. з ПДВ, руб. кап.	Усяго з ПДВ, руб.кап.
1	Масляны радыятар Timberg TOR21 1507 BC, (далей — суперпрыз)	1	149,00	149,00
2	Кропельная кававар-ка Holt HT-CM-005, (далей — прыз)	7	59,004	413,03

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Цёплая восень са «Звяздой» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2022 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які афарміў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2022 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд з 1 верасня па 21 кастрычніка 2022 года выразаная з газеты або з дадатковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 1 верасня па 21 кастрычніка 2022 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 21 кастрычніка 2022 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні «Цёплая восень са «Звяздой» Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Южык Жанна Міхайлаўна — галоўны таваразнавец РУП «Белдрук»;

Ганцарэвіч Святлана Міхайлаўна — загадчык аддзела рэалізацыі рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда»;

Брашко Алег Мікалаевіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 27 кастрычніка 2022 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прызоў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 2 лістапада 2022 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 2 кастрычніка 2022 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2022 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2022 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2022 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін па 31 снежня 2022 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, з панядзелка па суботу (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефонах: (017) 271 81 53, 311 17 40 для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 31 снежня 2022 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Цёплая восень са «Звяздой» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах: (017) 271 81 53, 311 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4223 ад 17.08.2022 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

СВЯТОЧНЫ ЗАРАД АД ПАЛЕШУКОЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фестывальная вёска міжнароднага этнакультурнага мерапрыемства сёлета ўмясціла больш як паўтары тысячы толькі гаспадароў падворкаў. Імправізаваныя сядзібы рознакаляровым багаццем расквецілі ўзбярэжжа Прыпяці. Дажджлівы настрой прыроды не перашкодзіў палешукам з імпэтам здзіўляць і «запальваць». Свае падворкі прадставілі восем раёнаў Гомельшчыны і пяць — Брэсцкай вобласці. Сустракалі гасцей домікі пчаляра, каваля, рыбака, ткача, разьбяра, бондара... Іх гаспадары запрашалі пазнаёміцца з разнастайнымі вырабамі і прадметамі ўжытку палешукоў.

«Палеская зямля — унікальны куток Беларусі са сваёй самабытнай культурай, старажытнымі звычаямі і гісторыяй. Фестываль сёлета збірае амаратараў фальклору, каб яшчэ больш напоўніць нас любоўю да роднага краю і ўразіць незвычайнымі талентамі», — словы падтрымкі ўдзельнікам і гасцям фестывалю адрасаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Прывітальны адрас ад кіраўніка дзяржавы з галоўнай фестывальнай сцэны зачытаў **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар ПЕТРЫШЭНКА.**

Фота Бел ТА

Заслужаны дзеяч культуры Беларусі Дзям'ян ЛЕМЯШЭЎСКІ, генеральны дырэктар ААТ «Мазырсоль» Уладзімір ДВОРНІК і старшыня Пінскага гарвыканкама Валерый РАБКАВЕЦ былі ўдастоены звання «Ганаровы паляшук».

Віцэ-прэм'ер па традыцыі агучыў імёны пераможцаў конкурсу «Ганаровы паляшук». Сёлета такое званне атрымалі генеральны дырэктар прадпрыемства «Мазырсоль» Уладзімір Дворнік, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Дзям'ян Лемяшэўскі і старшыня Пінскага гарвыканкама Валерый Рабкавец.

Пачэснымі гасцямі фестывалю сталі **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО,**

кіраўнік Брэсцкай вобласці Юрый ШУЛЕЙКА.

— Поспех свята вызначылі тры складнікі — унікальная прырода, найбагацейшая гісторыка-культурная спадчына і аўтэнтычныя народныя абрады і рамёствы, — перакананы Іван Крупко. — Самабытны Палескі край, дзе з асаблівай павагай захоўваецца беспярэпыннасць культурна-бытавых традыцый, выклікае ўсё большую цікавасць у гісторыкаў, этнографаў і культуролагаў.

І сапраўды аўтэнтычныя рамёствы — ганчарства, лозапляценне, выцінанка, роспіс па дрэве і шмат іншых — шырока прадстаўленыя на радах «Рамесныя слабады», якія расцягнуліся не на адзін кіламетр.

Прадстаўнікі раённых цэнтраў арыгінальна падавалі свае падворкі. «У мядзведзя ў бары» — такі падворак у лясным стылі афармілі майстры, прадпрыемствы і арганізацыі Петрыкаўскага раёна. Разнастайную сувенірную прадукцыю рэкламавалі майстрыхі Валянціна Фалеева, Вікторыя Стацэнка і Ганна Туравец. Цэнтральнае месца на падворку адвялі «Траўніцы» — гаспадыні, цалкам «сатканай» з траў, што растуць на Петрыкаўшчыне. Ідэю ўвасобіла народны майстар Валянціна Фалеева:

— Працавала над ёй звыш двух тыдняў. Пасля фестывалю разбіраць рука не падымецца, установім яе ў выставачнай зале нашага Дома рамёстваў як памяць у гонар сёлетняга «Клічу Палесся», — кажа майстрыха.

Кіраўнік народнага тэатральнага калектыву «Маска» Наталля ТАРАСЕНКА на падворку Нараўлянскага раёна сустракае гасцей разам са сваімі выхаванцамі.

— Мы — гарбузікі, і вось наша мама Гарбузіха, — смяюцца нараўлянскія школьнікі — удзельнікі калектыву.

— Доўга рэпеціравалі з дзецьмі наша прадстаўленне, самі шылі касцюмы. Апошнія два тыдні з раніцы да дзвюх ночы, — падзяліласяся Наталля Тарасенка.

Побач Хойніцкі раённы Дом рамёстваў запрашае гасцей на падворак «Суп з сямі круп».

— Удзельнічалі ў яго падрыхтоўцы ўсім раёнам, — кажуць **загадчыца Хойніцкага раённага Дома рамёстваў Людміла СМОЛЬСКАЯ і майстар народных мастацкіх рамёстваў Вольга ШЛЯХЦЕНКА.**

— У нас багаты падворак, бо з рога ўсяго многа, — пераконваюць заўзятыя ўдзельніцы фестывалю «Кліч Палесся». — Мы падрыхтавалі чайны пакой, краму арэхаў і сухафруктаў, лаўку з абярэгамі і нават выставу старых самавараў, якія збіралі па ўсім раёне.

Сёлета ўпершыню на фестывалі былі прадстаўлены Іванаўскі раён і Пінск.

— Абавязкова трэба зведаць, што такое мотальскія прысмакі, — пераконвае пазнаёміцца бліжэй з сапраўдным брэндам Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці **ўдзельнік калектыву «Лабуры» Яўген ЮХНІК.**

На Столінскім падворку давялося пагутарыць з Таццянай Нагар, Васілём і Алай Ільінскімі, якія прыехалі на «Кліч Палесся» з аграгарадка Рамель. Удзельнікі са Століншчыны падкрэсліваюць: кожны раз едуць сюды зарадзіцца атмасферай свята.

— Прывезлі дзіцячы танцавальны ўзорны калектыў і вакальную групу. Выступаем з вялікай танцавальная праграмай і аркестравымі нумарамі. Цікавімся афармленнем падворкаў, касцюмамі. Падабаецца, як з кожным разам усё больш развіваецца інфраструктура фестывалю, вельмі зручна для ўдзельнікаў і гасцей, — ухваляе Ала Ільінская.

Удзельнікі і госці фестывалю з задавальненнем адзначылі арганізацыю святочнай праграмы для дзяцей. Тэрыторыю дзяцінства «Палеская вясёлка» з конкурсамі, флэшмобамі, інтэрактыўнымі выставамі сваімі сіламі падрыхтавалі педагогі з Петрыкаўскага, Акцябрскага, Лельчыцкага, Мазырскага, Жыткавіцкага і Калінкавіцкага раёнаў, а таксама спецыялісты Гомельскага абласнога Палаца творчасці дзяцей і моладзі.

Традыцыйна ў рамках фестывалю прайшоў конкурс «Палеская прыгажуня — 2022». Самай прыгожай дзяўчынай беларускага Палесся была прызнана Валерыя Яраш з Мазыра. Тытул першай віцэ-міс заваявала жыхарка Петрыкава Паліна Бычкоўская, другой віцэ-міс стала Карына Маліноўская з Нароўлі.

Упершыню ў праграме свята былі прадстаўлены этназаафэст, рыцарскі бугурт-фэст і інтэрактыўная пляцоўка «Партызанскі край», прысвечаная Году гістарычнай памяці ў Беларусі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.
Петрыкаўскі раён.

Народнаму паэту Беларусі Пімену Панчанку — 105 гадоў

«Я не ставіў перашкоды на шляху бягучай вады...»

Пімен Панчанка нарадзіўся на моры, а вырас у лесе

«Ёсць пах, які нам мілы і родны ад нараджэння і да смерці: матчыных рук, малочны пах валосікаў сястрычкі і малога браткі, пах напаленай печы, свежавымытай падлогі, печанага хлеба, смажаных дранікаў, скошанага сена, разагрэтага бору, распілованых дошак, суботняй лазні, складзеных у грудок яблык і груш, вянкоў цыбулі і часнаку, каўбас на гарышчы, смажанага кабана, новых алоўкаў, падручнікаў і чаравікаў, палыну, чабору, мяты, пчалінага мёду, свежаразварanай і печанай бульбы, квашанай капусты, расцёртага лістка таполі, першага снегу, абдадзенага дажджом пылу, агню з бярозавых і яловых дроў, новага кажуха, конскага поту, талага снегу і грыбоў, грыбоў, грыбоў у розным стане...»

Так пісаць можа чалавек не толькі таленавіты, але і вельмі добры, шчыры, тонкі...

Гэтыя радкі належаць народнаму паэту Беларусі Пімену Панчанку, якому 23 жніўня спаўняецца 105 гадоў з дня нараджэння.

Давайце ўспомнім некаторыя адметныя факты з яго біяграфіі.

Нарадзіўся ля мора

Ні шторму, ні буры тады не было,
Калі нарадзіўся я ў Таліне.
Звычайнае сонца
звычайна ўзышло
Пасля гадзіны світальнай.

Не ўсе, чытаючы вершы народнага паэта, ведаюць, што ён нарадзіўся ля мора, і любоў да марскіх хваляў ужывалася ў ім побач з любоўю да беларускіх пушчаў. Сям'я яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі адправілася ў пошуку заробкаў у Рэвель, цяперашні Талін. Бацькі працавалі на суднабудаўнічым заводзе... Потым бацьку забралі ў войска, і маці Дар'я Панчанка з двума малымі дзецьмі падалася да маці на Ашмяншчыну. Але ўражанні ранняга дзяцінства засталіся назаўсёды.

«Бясконцыя расповеды мамы, эстонскія і латышскія словы і фразы, якія яна часам ужывала, успаміны аб тым, як у Рэвелі рэвалюцыю рабілі, ды і свае нейкія няпэўныя бачанні мора і карабёў, пакінулі ў душы маёй прыкметны след. Адсюль мая цяга да мора. Ужо, як кажуць, мужчынам у гадах я нямала паплаваў па морах і акіянах: і па Чорным, і па Каспійскім, і па роднай Балтыцы; плаваў вакол Еўропы і да Берага Слановай Косці, а ў 1958 годзе ў снежні ў моцны шторм пераплыў на лайнеры «Куін Мэры» Атлантычны — ад Нью-Ёрка да Шэрбура».



Автобиография.
Родился я 23 августа 1917 года в городе Ревеле (ныне Таллин) в семье рабочего-судостроителя. Родители мои — белорусские крестьяне - еще задолго до октябрьских событий уехали в Прибалтику в поисках заработка. Сам я и Таллин, и Ригу, и Балтийское море увидел и познал в конце сарокового года. Увидел и крепко полюбил. Впрочем, любовь к балтийским землям и городам, кипящим на моих глазах бурными революционными событиями и ярко отразившимся в моих первых детских впечатлениях, я унаследовал, по-видимому, от своих родителей, которые очень любили Ригу, Ревель, Таллин. Воспоминания о том, как работал в Ревеле революционный

У дзяцінстве лавіў шпіёнаў

У 1921-м сям'ю пераправілі праз граніцу ў СССР. Дзяцінства паэт правёў у Бягомлі. Тут скарыла яшчэ адна стыхія: лес. Тым больш пасля грамадзянскай вайны бацька абраў для сябе ляснуую прафесію: працаваў дзясятнікам, аб'ездчыкам, прарабам, ляснічым.

«У мястэчку Бягомль, у дрымучых лясах вярхоўя Бярэзіны, прайшло маё дзяцінства... Духмяная звонкая зямля, родны дом, напоўнены казкамі, паданнямі, легендамі. З малых гадоў усе мы вучыліся пасвіць у лесе кароў, збіраць ягады і грыбы, вязаць венікі, выразаць з балотнай бярозы чаўнаўкавыя кіі, а з лазы — дудкі і свісткі, знаходзіць птушыныя гнёзды, запасаць на зіму арэхі і рабіну...»

Успаміны тае пары цёплыя: *«У мястэчку, акрамя беларусаў, жыло шмат яўрэяў, былі рускія, татары, палякі і нават адзін літовец. Але я не памятаю ніводнага выпадку якога-небудзь «нацыянальнага канфлікту». Але быў і іншы аспект: «Раён наш быў памежны, і мы з пінерскіх гадоў былі прывучаны глядзець, ці не з'явіўся і ў нашых месцах чужы шпіён. Гульні нашы таксама мелі моцны памежны акцэнт».*

Янка Купала чытаў яго вершы

Пімен Панчанка распавядаў сваім родным, як у 1939-м, калі яму было 22 гады, давялося сустрэцца з Янкам Купалам. Адбылося гэта, калі пасля вызвалення Заходняй Беларусі пісьменнікі ехалі ў Беласток на народны сход, дзе мусіла адбыцца знакавая падзея — заканадаўчае замацаванне ўваходжання Заходняй Беларусі ў БССР. Сярод маладых літаратараў быў і Пімен Панчанка. З Купалам сустрэліся выпадкова, калі той ішоў па вагоне. І Янка Купала сказаў маладому Панчанку ўхвальнае: «Чытаў, чытаў».

Другі б літаратар з гэтай фразы зрабіў цэлую легенду ў падмацаванне свайго аўтарытэту. Але Панчанка быў чалавекам сціплым. Па сведчанні родных, казаў толькі: «Не ведаю, ці сапраўды чытаў мае творы Купала, ці не...»

Любіў Уітмена і сустракаўся з Меерхольдам

Рабочы Бабруйскага дрэваапрацоўчага завода, малады вясковы настаўнік, пачынаючы паэт — ва ўсе часы Пімен Панчанка апантана чытаў кнігі...

Дэлегацыя беларускіх літаратараў на IV з'ездзе пісьменнікаў СССР. У цэнтры — Пімен ПАНЧАНКА. Масква, 1967 год.

«У юнацтве мы прагна накідваліся на «Ціхі Дон» і «Разгром», на «Хаджэнне па пакутах» і артыкулы Максіма Горкага, а потым чыталі Ніцшэ і Панцеляймона Раманава, Панаіта Істраці і Бабеля», а яшчэ «захапіўся Генрыхам Гейнэ, французамі, асабліва Арцюрам Рэмбо, Уітмэнам».

Як бачыце, спіс годны і для сённяшняга чытача. А на той час — амаль неверагодны. Ніцшэ, Бабель, Панцеляймон Раманаў — адна крамола...

Калі ў 1938-м Пімен Панчанка прыняў удзел ва Усесаюзных курсах — канферэнцыі маладых пісьменнікаў нацыянальных рэспублік, кругагляд яшчэ пашырыўся. Давялося сустракацца з Аляксеем Талстым, экскурсію па «Траццякоўцы» для маладых пісьменнікаў і паэтаў праводзіў Грабар.

«Цікавай была сустрэча з Усеваладам Меерхольдам. Ён быў глыбока перакананы, што тэатр будучыні злучыць у сабе драму, оперу, балет, цырк і яшчэ шмат».

Дарэчы, у музыцы Панчанка таксама меў густ. Па сведчанні родных, любіў оперу «Норма» Беліні, «Балеро» Равеля.

Літаратурныя густы Пімена Панчанкі былі не самымі авангардными, але і кансерватарам назваць яго нельга.

А я маладых не лаю
За доўгія валасы,
А я маладым не раю
Галіцца дзеля красы.
Не бэшчу ні міні, ні максі,
А джынсы і сам надзеў.
Былі б толькі твары, не маскі
У маладых людзей.

Прасіўся з Ірана на Беларусь

Калі мы з архівістам Віталем Скалабанам рыхтавалі артыкул пра ліставанне пісьменнікаў з уладамі, сярод прыкладаў быў ліст, адпраўлены Піменам Панчанкам 28 мая 1945 года першаму сакратару ЦК КП(б)Б Панцеляймону Панамарэнку.

«Дорогой Пантелеймон Кондратьевич! Простите за беспокойство и назойливость. Осмелюсь еще раз просить об отзыве меня в Минск на какую угодно работу. Четыре года я не был в Белоруссии, а в настоящее время и вовсе оторван от моего народа, родного языка, белорусской общественной и литературной жизни и минской прессы. Из-за этого я не могу писать на темы, которые меня волнуют. Отечественная война окончена, но меня не отпускают и не думают отпускать. Свой патриотический долг я выполнял честно. Теперь, мне кажется, я принесу больше пользы произведениями и отдам делу возрождения Белоруссии все свои силы и скромные способности. Вся надежда на Вас».

Тое, што паэт засумаваў па роднай Беларусі, не дзіўна. Ён пайшоў у армію ў 1939 годзе, ужо аўтарам двух паэтычных зборнікаў — «Упэўненасць» (1938) і «Вераснёвыя сцягі» (1940). Але служба зацягнулася... Пімен Емяльянавіч прымаў удзел у вызваленні Заходняй Беларусі, потым пачалася Вялікая Айчынная вайна. Бранскі фронт, затым Калінінскі, праца ў франтавой газеце «За свабодную Беларусь» і ў сатырычным часопісе «Партызанская дубінка». Потым паэт быў пераведзены на Паўночна-Заходні фронт пад Старую Русу, дзе працаваў у газеце «Героический штурм». Колькі выдатных вершаў пра вайну тады напісалася!

А ў 1944 годзе штаб, дзе служыў Пімен Панчанка, перакінулі ў Іран.

Злева направа: М. Дубянецкі, А. Адамовіч, П. Панчанка, В. Быкаў, Н. Гілевіч (1979 год).

Гартанная песня завязла ў вушах,
Ад пылу зрабіўся я мельнікам.
Раве, нібы дрэнны акцёр, мой ішак,
Здзекуецца з пісьменніка.
Маўляў, раз прыехаў на поўдзень —
цярпі.

І горы, і спёку пякельную.
Даволі пісаў пра жніво і сярпы,
Пра смачны дымок
над патэльняю.

Падумаеш —
хітрасць у рыфмы цаляць
У садзе, руковым ад сораму.
А вось паспрабуй
напісаць пра цялят,
Што пасвіць іранец пад зорамі.

Вось адтуль, з экзатычных краявідаў, Панчанка і пісаў Панамарэнку.

Ні славы, ні скарбаў я не хачу,
Мне б толькі
прыйсці непрыкметна,
Зямлю сваю пад нагамі адчуць,
Надыхацца родным паветрам.

Дэмабілізаваўся паэт у 1946 годзе Вярнуўся ў Мінск і ўладкаваўся на працу ў часопіс «Вожык», які ўзначальваў Міхась Лынькоў, які Панчанку і запрасіў, а сярод супрацоўнікаў быў даўні сябар, Максім Танк.

Ажаніўся з сястрою дзяўчыны, з якой сустракаўся

Пасля «Вожыка» Пімен Панчанка перайшоў у штотыднёвік «Літаратура і мастацтва». Там працавала тэатральным крытыкам Тамара Бушко. Паэт пачаў заляцанні, маладыя людзі сталі сустракацца... Аднойчы Пімен праводзіў Тамару дахаты і пазнаёміўся з яе малодшай сястрой Зояй. Зоя была на сем гадоў маладзейшай за Панчанку... Але менавіта яна стала яго лёсам. Пімен і Зоя ажаніліся і шчаслива пражылі жыццё. Унук Панчанкі ўспамінаў:

«Па характары такой жонкі, як Зоя Кірылаўна, пакуль што ў нашых пісьменнікаў не адшукаць. Бабуля нідзе не працавала, хоць у яе была вышэйшая педагагічная адукацыя. Яна ўсю сябе прысвяціла мужу і яго творчасці. Калі творы дзеда перавыдаваліся, Зоя Кірылаўна рыхтавала іх да друку... Аднойчы была такая гісторыя. Зоя Кірылаўна паклікала доктара да Пімена Емяльянавіча. Але лекар кінуў дзеда, як толькі глянуў на бабулю, хуценька памераў ёй ціск, паклаў на насілкі і павёз на «хуткай». Таму што ў Зоі Кірылаўны быў ціск за дзвесце! Яна мала ўдзяляла ўвагі сабе, бо цалкам ахвяравала сябе дзеду».

Будзіў сям'ю, каб паглядзець на зоры

Безумоўна, склад душы паэта самы што ні на ёсць рамантычны... Калі сям'ёй адпачывалі ў доме творчасці Каралішчавічы, у жніўні, у час зарападаў, мог пабудзіць усіх сярод ночы: «Пайшлі, пайшлі!»

«І ён вёў нас на жытнёвае поле, яшчэ не зжатае. Мы выходзілі ў яго цэнтр і назіралі, як зоркі падаюць. Прыгожа. Цікава. І ў жыце ён распавядаў пра неба, пра зоркі. І адну сваю кніжку так і назваў «Млечны шлях», — распавядаў унук Андрэй.

Той дзень, лічы,
завянуў пустацветам,
Калі ты пяць хвілін пашкадаваў,
Каб дзецям паказаць
куточак свету
І харство людзей, і дрэў, і траў.

У інтэрнэце можна знайсці шмат мудрых цытат Пімена Панчанкі. Вось адна з іх, з дзённікаў паэта:

«У знойдзеным егіпецкім папірусе запісаны гордыя словы аднаго з фараонаў: «Я не чыніў зла людзям. Я не забіваў. Я не ставіў перашкоды на шляху бягучай вады...»

«Вось толькі падганю, вось толькі дараблю, прыдбаю на жыццё, тады і пажыву — так думаем, хоць ведаем: ніколі не падгонім, ніколі не даробім; яны ніколі не канчаюцца — жыццё і праца...»

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Правила проведения Рекламной игры

«ЗОЛОТО НЕ ЗА ГОРАМИ!»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Золото не за горами!» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Золото не за горами!» (далее – Рекламная игра).

В Правилах используются следующие термины:

Банк – ЗАО «Белорусско-Швейцарский Банк «БСБ Банк».

Карточка – банковская платежная карточка международной платежной системы Visa, эмитированная Банком.

Apple Pay, Samsung Pay и Garmin Pay – мобильные сервисы, позволяющие осуществлять с использованием Карточки платежи через мобильное устройство держателя Карточки.

1. Организатор Рекламной игры.

Организатором Рекламной игры является ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ», УНП 190771520, зарегистрированное Минским горисполкомом Республики Беларусь решением от 2 ноября 2006 года, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №190771520.

Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, 21/5-1.

2. Заинтересованное лицо Рекламной игры.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский Банк «БСБ Банк», УНП 807000069.

Республика Беларусь, 220004, г. Минск, пр-т Победителей, дом 23, корпус 4.

3. Участники Рекламной игры.

К участию в Рекламной игре приглашаются физические лица, держатели Карточек, эмитированных Банком, достигшие возраста 18 лет: граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь.

Участниками Рекламной игры не могут быть лица, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства; лица, состоящие в трудовых отношениях с Банком, а также Члены комиссии по проведению Рекламной игры.

4. Наименование Рекламной игры: «Золото не за горами!».

5. Территория проведения Рекламной игры: Республика Беларусь.

6. Срок начала Рекламной игры: 29 августа 2022 года.

7. Срок окончания Рекламной игры: 30 ноября 2022 года.

8. Наименование товаров (работ, услуг), в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра.

Рекламная игра проводится в целях стимулирования безналичных расчетов физическими лицами с использованием Карточек посредством использования **Apple Pay, Samsung Pay и Garmin Pay**.

8.1. При использовании в Правилах термин «карточка» используется в значении, определенном статьей 273 Банковского кодекса Республики Беларусь: «Банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь».

9. Призовой фонд Рекламной игры.

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств и имущества Заинтересованного лица в размере 56 965,91 (пятьдесят шесть тысяч девятьсот шестьдесят пять) белорусских рублей 91 копейка. Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:

Таблица № 1. Призовой фонд Рекламной игры.

№	Наименование	Далее в правилах	Колво, шт.	Стоимость за ед., бел. рублей	Всего, бел. рублей
1	Золотой мерный слиток 20 г А20608	Приз 1	1	3010,00	3435,71
	Денежные средства			425,71	
2	Золотой мерный слиток 20 г А20609	Приз 2	1	3010,00	3435,71
	Денежные средства			425,71	
3	Золотой мерный слиток 20 г А20610	Приз 3	1	3010,00	3435,71
	Денежные средства			425,71	
4	Золотой мерный слиток 20 г А20696	Приз 4	1	3010,00	3435,71
	Денежные средства			425,71	
5	Золотой мерный слиток 250 г А02953	Главный приз	1	37 625,00	43 223,07
	Денежные средства			5598,07	
ИТОГО					56 965,91

10. Порядок участия в Рекламной игре.

10.1. Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 29.08.2022 по 25.09.2022 включительно (далее – «Период участия»):

10.1.1. Являться или стать держателем Карточки;

10.1.2. Зарегистрироваться на интернет-сайте igra.bsb.by (далее – «Сайт»), заполнив регистрационную форму на русском/белорусском языке, содержащую следующие персональные данные:

- фамилию (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно, при наличии) держателя Карточки;
- дату рождения держателя Карточки (обязательно);
- номер мобильного телефона белорусского мобильного оператора держателя Карточки в формате «+375XXXXXXXXX» (обязательно);
- адрес электронной почты держателя Карточки (обязательно);
- первые 6 цифр номера Карточки (обязательно);
- последние 4 цифры номера Карточки (обязательно).

Также Участнику необходимо подтвердить согласие на участие в Рекламной игре, ознакомление с настоящими Правилами, а также подтвердить согласие на обработку своих персональных данных и информации, составляющей банковскую тайну, на Сайте, путем проставления соответствующей галочки при заполнении регистрационной формы.

10.1.3. Добавить Карточку к **Apple Pay, Samsung Pay или Garmin Pay**, если на момент регистрации в Рекламной игре у Участника Рекламной игры нет добавленной к **Apple Pay, Samsung Pay или Garmin Pay** Карточки.

10.1.4. С соблюдением правил пользования Карточкой, совершить одну или несколько безналичных операций посредством использования **Apple Pay, Samsung Pay или Garmin Pay**, каждая на сумму не менее 50,00 (пятидесяти) белорусских рублей, по оплате товаров/работ/услуг на территории Республики Беларусь, за исключением операций, указанных в п.10.5 Правил.

10.2. Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное число раз, совершая новые безналичные операции согласно п. 10.1.4 настоящих Правил.

В Рекламной игре принимают участие безналичные операции Участника, совершенные после регистрации Участника на Сайте, а также отраженные по банковскому счету Участника, в соответствии с Таблицей № 2 п. 11.1 настоящих Правил.

10.3. Каждая уникальная безналичная операция на сумму не менее 50,00 (пятидесяти) белорусских рублей, совершенная в соответствии с настоящими Правилами, участвует в розыгрыше призов, согласно порядку проведения розыгрышей (Таблица № 2 п. 11.1 настоящих Правил).

10.4. Участнику присваивается один Номер участника для розыгрыша призов за каждые 50,00 (пятьдесят) белорусских рублей безналичной операции, соответствующей п.10.1.4 настоящих Правил, и совершенной с 29.08.2022 по 25.09.2022, согласно периодам участия, указанным в Таблице № 2 п.11.1 настоящих Правил. То есть Участнику, совершившему безналичную операцию на сумму 100,00 (сто) белорусских рублей, будет присвоено 2 (два) Номера участника для розыгрыша призов.

10.4.1. В розыгрыше Главного приза участвуют все безналичные операции, совершенные Участниками в соответствии с настоящими Правилами, а также отраженные по банковскому счету Участника.

10.5. Не являются основанием для участия в Рекламной игре:

- безналичные операции, совершенные до и после Периода участия;
- безналичные операции на сумму меньше 50,00 (пятидесяти) белорусских рублей;
- безналичные операции по Карточке, совершенные без использования **Apple Pay, Samsung Pay или Garmin Pay;**
- безналичные операции, совершенные в системе ЕРИП;
- операции по пополнению банковского счета;
- операции, совершенные посредством мобильного и интернет-банкинга;
- операции по переводу денежных средств с одной банковской платежной карточки на другую банковскую платежную карточку;
- операции по оплате услуг мобильных операторов;
- безналичные операции, которые были отменены и/или по которым были возвращены деньги на Карточку;
- выдача наличных денежных средств в АТМ (банкомат) и ПВН (пункт выдачи наличных);
- операции в казино и иных игорных заведениях, оплата ставок и пари, в том числе через Интернет;
- оплата комиссионных вознаграждений банкам, погашение кредитов через кассы, устройства самообслуживания;
- безналичные операции по оплате товаров/работ/услуг в иностранных организациях торговли и сервиса (например, иностранные интернет-магазины).

10.6. Организатор оставляет за собой право проверки данных о достоверности совершенных безналичных операций Участниками Рекламной игры, в том числе обратиться к Заинтересованному лицу в целях проверки безналичных операций, участвующих в Рекламной игре.

10.7. Организатор не несет ответственности за ошибки, допущенные Участником при заполнении персональных данных при регистрации на Сайте.

11. Место, даты, время и порядок проведения розыгрышей призового фонда, в том числе порядок определения выигравших Участников Рекламной игры:

Розыгрыши призов проходят по адресу: Республика Беларусь, город Минск, пр-т Победителей, д.23, корп. 4 (головной офис «БСБ-Банк») в соответствии с датами и временем, указанными в Таблице 2.

Розыгрыши призов проводятся открыто, с возможностью присутствия Участников Рекламной игры.

11.1. Розыгрыши призов проводятся согласно следующему графику:

Таблица № 2. Розыгрыши призов:

Номер розыгрыша	Дата и время розыгрыша	Период регистрации Участника на Сайте	Период совершения безналичной операции	Период отражения безналичной операции по счету Участника	Призы для розыгрыша
1	**15.09.2022 15.00**	**с 29.08.2022 по 04.09.2022**	**с 29.08.2022 по 04.09.2022**	**с 29.08.2022 по 09.09.2022**	Приз 1 – 1 шт.
2	**22.09.2022 15.00**	**с 29.08.2022 по 11.09.2022**	**с 05.09.2022 по 11.09.2022**	**с 05.09.2022 по 16.09.2022**	Приз 2 – 1 шт.
3	**29.09.2022 15.00**	**с 29.08.2022 по 18.09.2022**	**с 12.09.2022 по 18.09.2022**	**с 12.09.2022 по 23.09.2022**	Приз 3 – 1 шт.
4	**11.10.2022 15.00**	**с 29.08.2022 по 25.09.2022**	**с 19.09.2022 по 25.09.2022**	**с 19.09.2022 по 30.09.2022**	Приз 4 – 1 шт.
			с 29.08.2022 по 25.09.2022	**с 29.08.2022 по 30.09.2022**	Главный приз – 1 шт.

11.2. Для осуществления каждого розыгрыша призов формируется Список, в котором за каждые 50,00 (пятьдесят) белорусских рублей безналичных операций, соответствующих Правилам, Организатор присваивает Номера участника для розыгрыша призов в хронологическом порядке согласно дате и времени совершения безналичной операции Участником. В случае совпадения у нескольких Участников даты и времени совершения безналичных операций, Номера участника присваиваются по фамилии, имени и отчеству (при наличии) Участника по алфавиту.

Все Номера участников в каждом розыгрыше призов имеют одинаковую разрядность.

11.2.1. Каждый Список для розыгрыша призов содержит следующую информацию: номер участника, фамилию, имя, отчество (при наличии) Участника, адрес электронной почты (e-mail), номер телефона Участника, дату и время совершения безналичной операции, дату и время отражения безналичной операции по банковскому счету, сумму безналичной операции, дату регистрации на Сайте.

11.3. Для проведения каждого розыгрыша используется лототрон и набор шаров в количестве 10 (десяти) штук с цифрами от 0 (нуля) до 9 (девяти). Определение выигрышных Номеров участников происходит путем их формирования слева направо из цифр на шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

11.3.1. Для определения цифры первого слева разряда выигрышного Номера участника в лототрон помещаются шары с цифрами от 0 (нуля) до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего по порядку номера в Списке. Из лототрона извлекается один шар. Цифра на шаре вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного Номера участника.

11.3.2. После этого в лототрон загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, который определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах Номеров участников. При наличии совпадения цифра вытянутого шара записывается в соответствующий разряд выигрышного Номера участника – и шар возвращается в лототрон; в противном случае – извлеченный шар с цифрой не возвращается в лототрон, а извлекается следующий шар до получения нужного совпадения.

11.3.3. Шары извлекают до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон цифр соответствующих разрядов Номеров участников в Списке. Таким образом, формируются все выигрышные Номера участников – Победителей призов.

11.4. При проведении каждого розыгрыша дополнительно определяются по одному резервному победителю для каждого приза. Резервным победителем становится следующий за выигрышным по Списку Номер участника, принадлежащий другому Участнику.

В случае если Номер участника резервного победителя принадлежит основному Победителю приза в Рекламной игре, или Участнику, уже ставшему резервным победителем другого приза, то выигрышным становится следующий после него первый Номер участника иного Участника.

11.5. Результат каждого розыгрыша в обязательном порядке фиксируется в протоколе розыгрыша, который подписывается присутствующими на заседании членами комиссии по проведению Рекламной игры.

12. Порядок уведомления Победителей о результатах розыгрышей, порядок получения выигрышей.

12.1. Организатор в течение трех рабочих дней после проведения розыгрыша уведомляет Победителей о выигрыше посредством направления извещения по электронной почте, указанной Победителями при регистрации на Сайте. Дополнительно Организатор может уведомлять Победителей о выигрыше путем осуществления звонков по номеру мобильного телефона, указанному при регистрации на Сайте.

12.2. Для получения призов Победителям, после уведомления о выигрыше, необходимо прибыть в офис Организатора по адресу: г.Минск, ул. Кальварийская, 21/5-1 не позднее 16.11.2022 по рабочим дням с 10.00 до 18.00 или в субботу 05.11.2022 с 11.00 до 14.00. При себе Победителю необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (паспорт/вид на жительство в Республике Беларусь/удостоверение беженца), для предъявления Организатору и использования данных при оформлении необходимых документов в рамках Рекламной игры. Копии данных документов Организатор оставляет у себя.

12.3. Приз не вручается основному Победителю, а вручается резервному Победителю в случае, если основной Победитель:

12.3.1. отказывается от получения приза, о чем письменно извещает Организатора;

12.3.2. нарушает (не выполняет) условия Правил, в том числе не предоставляет необходимые документы, либо не является за получением приза в сроки и в порядке, установленные пунктом 12.2 Правил;

12.3.3. не выходит на связь с Организатором (невозможность получения уведомлений Организатора из-за неактуальных сведений при регистрации на Сайте).

12.4. Резервные Победители, которым перешло право на получение приза, уведомляются об этом не позднее 18.11.2022, в порядке, предусмотренном пунктом 12.1 Правил.

Резервные Победители должны выполнить действия, перечисленные в пункте 12.2 Правил, не позднее 30.11.2022. Призы будут выданы резервным Победителям не позднее 30.11.2022.

В случае если резервный Победитель не выполнит действия в обозначенный срок, он утрачивает право на получение приза. Невостребованные призы после окончания Рекламной игры возвращаются Заинтересованному лицу.

12.5. Выдача призов представителям Победителей осуществляется по нотариально удостоверенной доверенности.

12.6. Призы не подлежат замене. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена количеством и видом призов, указанных в Правилах.

12.7. При получении всех призов Победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь, и осуществляется Организатором. Удержание с Победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи призов из денежной части призов (денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

13. Комиссия по проведению Рекламной игры.

13.1. Для контроля за соблюдением официальных Правил Рекламной игры, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

1. Канасевич Мария Евгеньевна – начальник департамента маркетинга ЗАО «БСБ Банк»;
2. Бардашевич Анна Михайловна – экономист отдела разработки и развития розничных продуктов департамента розничных операций ЗАО «БСБ Банк»;
3. Шуляк Валерия Сергеевна – маркетолог департамента маркетинга ЗАО «БСБ Банк»;
4. Шорр Полина Андреевна – специалист по работе с клиентами ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ»;
5. Атрашкевич Екатерина Владимировна – специалист по работе с клиентами ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ».

14. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры.

14.1. Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

14.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок до 29.11.2022 включительно.

14.3. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на Интернет-сайте igra.bsb.by, а также по телефонам горячей линии: + 375 17 306 20 40, +375 29 306 20 40, +375 44 306 20 40, +375 25 306 20 40 круглосуточно, без выходных.

15. Прочие условия.

15.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

15.2. Участники Рекламной игры, претендующие на получение призов, обязуются предоставить все необходимые документы для получения призов.

15.3. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при его использовании Участником (например, плохое соединение с провайдером и т.д.), а также за работу операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т. д.).

15.4. Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Участником в случае недостоверной информации, предоставленной Участником.

15.5. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

15.6. Все возможные претензии участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору Рекламной игры по почтовому адресу: Республика Беларусь, 220004, г.Минск, ул. Кальварийская, 21/5-1.

Свидетельство № 4221 о государственной регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 9 августа 2022 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Моцны слабы пол

МАСТАЦТВА ЎСЁ ПАСПЯВАЦЬ

Людміла АНІСЬКО імкнецца жыць паводле вялікага Шэкспіра: «Ведаць больш, чым астатнія. Працаваць больш за астатніх. Чакаць менш, чым астатнія».

ВЫПРАБАВАННЕ ПАНДЭМІЯЙ

З загадчыцай клініка-дыягнастычнай лабараторыі Гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы (ГКІБ), галоўным пазаштатным спецыялістам па лабараторнай дыягностыцы Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Людмілай Аніська я пазнаёмілася на чацвёртым месяцы барацьбы з COVID-19. Гэта быў вельмі гарачы час для калектыву. У параўнанні са звычайным рэжымам нагрузка ў лабараторыі ўзрасла шматразова. Калі раней нормай было — даследаваць метадам ПЛР 100 узораў за змену, то на піку пандэміі ў суткі іх паступала да 2000. Працавалі без перапынкаў, а прабірак у маразільніку станавілася ўсё больш. Здаралася, нехта з супрацоўнікаў зрываўся, нават плакаў. Па ініцыятыве Людмілы Аніська калектыў перайшоў на кругласутачны, трохзменны рэжым работы: лабараторыя не прастойвала і гадзіны. Быў перыяд, калі яна спала ўсяго некалькі гадзін за суткі. Паднімалася на досвітку і ў пяць раніцы бегла ў клініку. Тыя, хто добра яе ведаюць, адзначаюць: тады, на піку пандэміі, ледзь не ўпершыню бачылі Людмілу па-сапраўднаму стомленай.

— Толькі праз год пасля прыходу да нас COVID-19, нарэшце, адчулі, што стала лягчэй, можна крыху выдыхнуць, — прызнаецца Людміла Аніська. — Рада, што справіліся, навучыліся хутка перабудоўвацца, адаптавацца да новых умоў работы, практычна без страт захавалі калектыў.

СІНДРОМ ДАСЛЕДЧЫКА

— Яшчэ ва ўніверсітэце, на практычных занятках у інфекцыйнай бальніцы, заўсёды думала: вось бы мне тут працаваць. І мары спраўдзіліся, — расказвае Людміла Аляксандраўна. — Спраўдзіліся збольшага таму, што мне заўсёды шанцавала на людзей. Аб вакансіі ў лабараторыі мне паведаміла калега Ларыса Іванаўна Косцікава з Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, куды я трапіла пасля заканчэння БДМУ. Да кіраўніцтва падрыхтавала ранейшая загадчыца лабараторыі Тамара Альбертаўна Рагачова. Маім навуковым кіраўніком пры абароне дысертацыі па кляшчовых інфекцыях быў член-карэспандэнт НАН Беларусі, прафесар, доктар медыцынскіх навук Ігар Аляксандравіч Карпаў.

Пяць гадоў Людміла Аніська ўзначальвае клініка-дыягнастычную лабараторыю. Яе пасада прадугледжвае не толькі арганізацыю розных даследаванняў, але і павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў, закупку сучаснага абсталявання і рэагентаў, удзел у скрынінгавых праектах. Па словах Людмілы Аляксандраўны, з калектывам (гэта 39 чалавек) ёй пашанцавала: хоць ён пераважна жаночы, але згуртаваны і дастаткова стабільны. Падставіць плячо, падмяніць тут — звычайная справа. А на розных атэстацыях традыцыйна адзначаюць высокі ўзровень падрыхтоўкі супрацоўнікаў.

Людміла Аніська перакананая: працаваць у іх з калегамі, але і са студэнтамі. Людміла Аляксандраўна — дацэнт кафедры інфекцыйных хвароб БДМУ.

— Людміла Аляксандраўна — чалавек на сваім месцы. Яна на рэдкасць кампетэнтны, прагрэсіўны спецыяліст, добры арганізатар, чулы кіраўнік, — характарызуе калегу ўрач гарадскога кабінета кантролю якасці лабараторных даследаванняў Таццяна Ясюкевіч.

Вядома, за 15 гадоў здаралася ўсякае. Калі Людміла Аніська ўзначальвала прафсаюзную арганізацыю бальніцы, магла часам нават паплакаць з-за несправядлівых слоў у свой адрас. Але нават тады ні разу не пашкадавала, што прыйшла працаваць у гэтыя сцены.

З дочкамі Юляй і Машай.

З мужам Анатолем.

лабараторыі пасапраўднаму цікава. Да іх рэгулярна звяртаюцца па дапамогу клініцысты, каб разабрацца ў этыялогіі захворванняў, удакладніць дыягназ пацыентаў. Гэта не заўсёды атрымліваецца зрабіць адразу. Даводзіцца шукаць інфармацыю, у тым ліку ў замежных крыніцах: без валодання англійскай мовай медыкам сёння не абысціся! Калі ўдаецца дакапацца да ісціны, Людміла Аніська адчувае вялікую радасць. Разгадваць прафесійныя рэбусы — самае прывабнае для яе ў рабоце.

— Прафесія ўрача мае на ўвазе сталае развіццё, шырокія веды, прычым не толькі па сваім профілі. Без гэтага ты як спецыяліст хутка дэградуеш і не можаш прасоўвацца наперад свой напрамак, — перакананая мая суразмоўніца.

Вучыцца, удасканальвацца, развівацца — любімыя заняткі Людмілы Аніська.

Кандыдацкую дысертацыю яна пісала вечарамі, часам начамі, у выхадныя. Пандэмія COVID-19 дала штуршок, каб узяцца за доктарскую. Сваімі ведамі яна дзеліцца не толькі разам з ёй хадзілі дочкі — Юля і Маша. Так што да каратэ ў гэтай сям'і ў той ці іншай ступені далучыліся ўсе.

Старэйшую дачку Людміла нарадзіла студэнткай. Юля з'явілася на свет у жніўні, а ў верасні маладая маці выйшла на вучобу. Акадэмічных водпускаў вырашыла не браць: знайшлі няню. Маша нарадзілася, калі Людміла ўжо працавала. Знаходзячыся ў дэкрэтным водпуску па доглядзе малодшай, Людміла ўвайшла ў склад бацькоўскага камітэта ў старэйшай, якая пайшла ў школу.

ЛЁГКАЯ НА ПАД'ЁМ

Людміла Мешчаненка (дзявочае прозвішча гераіні) з дзяцінства адрознівалася выключнай актыўнасцю. Радыёгурток, макрамэ, мяккая цацка, танцы, музычная школа, выпальванне — чым толькі яна не захаплялася ў школьныя гады... У 13 гадоў прыйшла ў секцыю каратэ. Затрымалася не толькі таму, што падабаўся гэты від спорту, але і дзякуючы цудоўнай атмасферы, якая там панавала.

І хоць пазней па сямейных абставінах трэніроўкі прыйшлося перапыніць, праз нейкі час зноў вярнулася да іх. Сёння кандыдат у майстры спорту, уладальніца двух данаў, Людміла Аніська тройчы на тыдзень наведвае спартыўную залу і нават працягвае выступаць на спаборніцтвах. Летась стала чэмпіёнкай Беларусі па шатакан каратэ-до.

— Каратэ дапамагае падтрымліваць форму і заставацца лёгкай на пад'ём, — лічыць Людміла Аніська. — Акрамя таго, у зале хутка пераключаешся з прафесійных праблем і хатніх клопатаў і тым самым эмацыянальна разгружаешся.

На занятках каратэ яна ў свой час пазнаёмілася з будучым мужам Анатолем. Быў час, калі на трэніроўкі дачок сваім прыкладам. І я імі задаволеная: яны самастойныя, не распешчаныя, могуць знайсці выйсце з любой сітуацыі. Юля скончыла 5-ы курс лечфака БДМУ, падзарабляе ў нашай бальніцы медсястрой. Маша хоча быць ветэрынарам.

Апроч клопату аб сям'і, рабоце, каратэ, Людміла вельмі любіць дачныя радасці: ёй падабаецца вырошчваць нешта новае, глядзець, як спеюць агародніна і садавіна, распускаюцца кветкі. Дакрананне да зямлі, зносіны з прыродай — выдатная псіхатэрапія.

— Калі я хадзіла з мамай на каратэ, часам чула ад іншых, быццам у яе строгі погляд, — кажа дачка Юля. — Але на самай справе мама не строгая. Яна працавітая, справядлівая, спагадлівая. А яшчэ вельмі адказная і неверагодна арганізаваная. Нават не разумею, як у яе атрымліваецца столькі ўсяго паспяваць.

— Уменне Люды ставіць мэты і дамагацца іх, безумоўна, захапляе, — дапаўняе трэнер па шакатан каратэ-до Алена Шчарбакова. — А яшчэ яна пазітыўны, лёгкі чалавек у адносінах да людзей, жыцця. Нават у цяжкіх сітуацыях не ныне, не культывуе праблемы, а імкнецца іх «разруліць».

Сама Людміла Аніська перакананая: чым больш робіш, тым больш паспяваеш.

— Не магу сказаць, што так ужо шмат увагі ўдзяляла дзяўчынкам, — прызнаецца Людміла Аніська. — Сям'я для мяне — самая вялікая каштоўнасць. Але і без работы сядзець я адназначна б не магла. Для мяне важная самарэалізацыя. Імкнулася выхоўваць і яшчэ ёй вельмі падабаюцца правілы дасягнення поспеху ад Шэкспіра: «Ведаць больш, чым астатнія. Працаваць больш за астатніх. Чакаць менш, чым астатнія».

Вольга ПАКЛОНСКАЯ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва Людмілы АНІСЬКО.

Пісьменніцкія вандроўкі

Маўчанне піраміды і гучанне старадрукаў

Літаратурная Уздзеншчына

Кожны вандруючы бачыць сваё... Мастак падмячае асаблівыя спалучэнні колераў, прыродазнаўца — рэдкія расліны, гісторык — сляды мінулых падзей... Пісьменнік думае пра кнігі і іх стваральнікаў.

Гісторыя беларускай кнігі не можа быць напісаная без згадкі пра горад з дзіўнай назвай Уздзя, што на рацэ Уздзянцы, за дваццаць два кіламетры ад станцыі Негарэлае, дзе калісь праходзіла граніца паміж БССР і Заходняй Беларуссю... Датай заснавання Уздзы лічыцца 8 мая 1494 года — гэта было ўладанне шляхціца Корсака.

Я пісала пра нашу вандроўку ў тыя ж мясціны, у Кухцічы, звязаныя з імем Сымона Буднага, аўтара першай беларускай друкаванай кнігі — «Катэхізіса». А на тым «Катэхізісе» Сымон Будны пакінуў прыпіску: «пісано во Уздне року от народжання Сына Божага ў 1572, месяца июня, 30 дня».

Уздна належала таму ж мецэнату і прапаведніку Мацею Кавячынскаму, што і Кухцічы... Менавіта ў свае ўладанні перавёз ён друкарню з Нясвіжа, калі Радзівіл Сіротка, сын зацятага пратэстанта Радзівіла Чорнага, памяняў веравызнанне і пазбаўляўся ад сувязяў са «схізматыкамі»...

Дарэчы, ёсць версія, што «Катэхізіс» друкаваны шрыфтамі друкарні Францыска Скарыны... Так што Уздна знаходзіцца не на адгалінаванай сцежцы, а на шырокім гасцінцы гісторыі беларускай кнігі. Пра што дарэчы згадаць напярэдадні Дня беларускага пісьменства.

Таямніцы піраміды

А пачалося наша падарожжа ва Уздну з... могілак. З аднаго з самых незвычайных збудаванняў, якое я пабачыла на роднай Беларусі.

Уявіце сабе: звычнага выгляду магілы, дрэвы... А на іх фоне ўзвышаецца каменная, амаль чорная піраміда, на квадратным цокалі, з вострым верхам, які пагрозна ўздымаецца ў беларускае неба... Проста містыка. Тым болей прызначэнне ўздзенскай піраміды тое ж, што і егіпецкіх: пахавальня. Толькі не фараонаў, а роду Завішаў, магнатаў, якім належала наваколле.

Містычная ўсыпальня з'явілася ў дзевятнаццатым стагоддзі — мода на падобную экзотыку ўзнікла ў арыстакратаў усяго свету пад уплывам афрыканскіх паходаў Напалеона ў 1798—1801 гадах. Гісторыя Старажытнага Егіпта стала крыніцай вобразаў і сюжэтаў, гонарам было здабыць для хатняй калекцыі мумію ці папірус...

Зразумела, таямнічае збудаванне заўсёды прыцягвала цікаўных... Хто шукаў тут скарбы, хто сцвярджаў пра масонскае паходжанне ці далучанасць уладальніка да алхіміі і чорнай магіі... Тым больш што, акрамя памяшкання ўнізе з нішамі для пахаванняў, наверсе піраміды ёсць яшчэ адзін невялікі пакой, на вышыні каля васьмі метраў, наконт прызначэння якога дасюль няма адзінай версіі. Ці таемныя богаслужэнні там ладзілі, ці спірытычныя сеансы, ці алхімічная лабараторыя была?

Капліца-пахавальня Завішаў унесеная ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў... Праўда, стан яе не тое каб выдатны. Уваход абараняюць краты. Зазіраючы праз іх, бачым невялікае памяшканне са скляпеністай столлю, цагляны алтар, ля якога — тры кошыкі штучных кветак. Перад уваходам — рэшткі калон, да сцяны збоку прыхілены жорнаў... Круглыя адтуліны ў сценах — быццам байніцы...

Адчуванне сапраўды містычнае...

«Няма ў свеце нічога мацнейшага ад веры»

Але ёсць на ўздзенскіх могілках і пахаванне, якое пакідае зусім іншыя адчуванні.

Вялікі металічны чорны крыж з абразом, шыльда з надпісам «Святый священномученице Михаиле, моли Бога о нас», помнік з надпісам «Новицкий Михаил Константинович. 21.11.1889. 30.04.1935. Дорогому папочке от детей». Лампадкі, кветкі... І стэнд з інфармацыяй.

А магіла гэта айца Міхаіла Навіцкага, які нарадзіўся ў сяле Сімончы Тураўскай воласці Мазырскага павета ў сям'і святара і таксама абраў сабе духоўны шлях. Нягледзячы на нястачу, Міхал скончыў гімназію, гісторыка-філалагічны факультэт Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта... Ажаніўся з Зіновіяй, таксама дачкой святара. Выкладаў лаціну ў Мінскай мужчынскай гімназіі. А святаром Міхаіл Навіцкі зрабіўся ў 1920 годзе. Самы небяспечны для гэтага час. Быў прызначаны служыць у Петрапаўлаўскай уздзенскай царкве. Жылі бедна... Нават дома свайго не мелі. Пяцёра дзяцей... Матушка Зіновія пачала шыць коўдры... Барацьба з рэлігіяй узмацнялася. Айцу Міхаілу неаднойчы прапаноўвалі адмовіцца ад веры, абяцаючы добрую працу. Дзяцей не прымалі ў школу. Калі ў 1933-м зачынілі і перарабілі ў збожжавы склад Петрапаўлаўскі храм, айцец Міхаіл пачаў служыць у вартоўні, куды і перасяліўся. Ён паўтараў: «Няма ў свеце нічога мацнейшага ад веры».

У 1935-м, напярэдадні Вялікай Суботы, калі хворы айцец Міхал ляжаў у вартоўні, туды ўварваліся два чалавекі, пачалі збіваць бацюшку, патрабуючы нейкіх каштоўнасцяў...

Айцец Міхаіл не сказаў пра гэта здарэнне нікому... Велікодную службу адправіў у ложку — падняцца не мог... На трэці дзень пасля Вялікадня памёр. Яго сям'ю праз тры месяцы выслалі..

Трое сыноў Міхаіла Навіцкага ваявалі. Адзін загінуў у Фінскую кампанію, два іншыя — падчас Вялікай Айчыннай. 10 кастрычніка 1942 года на Паўднёвым фронце сын айца Міхаіла Мікалай закрыў сабою амбразуру дота. Яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. На Ленінградскім фронце служыла дачка Наталля.

На дошцы — здымак сям'і свяшчэннамучаніка... Разумны добры твар у акулярах святара, гожае аблічча жонкі, мілыя бялявенькія дзеткі...

Кажуць, забойцы айца Міхаіла ў хуткім часе пасля яго гібелі памерлі, перад смерцю паспелі прызнацца...

На магіле свяшчэннамучаніка свежыя кветкі.

Царква на Чырвонай плошчы

А наш шлях далей, у сам горад, назва якога ўзнікла, ці калі татарскі хан аброць, вышытую золатам, тут у рэчку ўпусціў, ці калі ладзілі тут праз балаты грэблю, якая па літоўску — «узда»... Ідзём на Чырвоную плошчу.

Так, так, ва Уздзе ёсць свая Чырвоная плошча! Мы стаім ля дома з чырвонай цэглы, на франтоне якога — лічбы 1913 і рэшткі надпісу «Торговля», на сцяне шыльда: «Красная площадь, 11».

Насупраць — кінатэатр «Кастрычнік», за чырвоным фасадам якога блішчаць купалы царквы. Так што ва Уздзе Петрапаўлаўская царква, пабудаваная ў 1905 годзе паводле праекта архітэктара Струева, стаіць на Чырвонай плошчы — такі яе афіцыйны адрас, «Чырвоная плошча, 20». Менавіта тут служыў бацюшка Міхаіл Навіцкі.

Вядома, калі тут праходзіў юны месціч Кандрат Атраховіч, ураджэнец суседняй вёскі Нізок, назва плошчы была зусім іншай.

Так, Кандрат Атраховіч, вядомы нам па псеўданіме Кандрат Крапіва, родам адсюль, з гэтых мясцін. Сёння ва Уздзе ёсць школа яго імя, музейная экспазіцыя...

Дарэчы, ёсць у лёсе знакамітага байкапісца, які гадаваўся ў сялянскай сямі, сувязь з мясцовымі магнатамі... Знайшла ва ўспамінах унучкі Кандрата Крапівы Алены Атраховіч цікавы эпізод, дакладней сямейную легенду. Былі ва ўладальніцы суседніх з Уздой Кухціч, Магдалены Радзівіл з Завішаў, сябры — рускія дваране Аляксей і Алена Пракопцавы, гасцявалі ў яе часта. Іх дачка Алена закахалася ў маладога афіцэра, а той загінуў адразу пасля заручын. Нявеста так сумавала, што адпрэчвала ўсіх жаніхоў, якіх падшуквалі бацькі. Урэшце бацька, Аляксей Пракопцаў, раззлаваўся і заявіў, што калі яна адмовіць наступнаму шляхетнаму жаніху, пазбавіць яе спадчыны і выдасць замуж за простага селяніна.

Алена адмовіла.

Пракопцаў звярнуўся да Магдалены Радзівіл з просьбай параіць добрага хлопца з яе сялян. Пані Магдалена паказала на Кастуся Махнача з вёскі Забалацце, выдатнага рамесніка, які рабіў ёй мэблю.

І Пракопцаў выканаў сваю пагрозу: выдаў дачку замуж за таго Кастуся Махнача. Былая паненка да сялянскай працы была непрывычная, аднавяскоўцы смяяліся... потым пачалі лічыць вядзьмаркай за зялёныя вочы і адасобленасць. А Кастусь жонку вельмі кахаў, аберагаў, хоць пражыць разам давялося нядоўга. У няроўнай пары нарадзілася дачка Алена. Вось яна і стала жонкай Кандрата Крапівы.

Дарэчы, стрыечная пляменніца Алены Махнач — пісьменніца Лідзія Арабей — таксама з Уздзеншчыны.

Літаратурная грыбніца

Тут увогуле вялікая, як кажуць, «літаратурная грыбніца». З Уздзеншчыны Фадзей Булгарын, пра адыёзную асобу якога дасюль вядуцца спрэчкі... Прынамсі, ён пакінуў цікавыя ўспаміны пра норавы беларускай шляхты і падарожныя нататкі пра Беларусь, а ў сваіх папулярных творах апісаў шмат дзівосаў з будучыні: акваланг, ксераксы, булённыя кубікі...

З адной вёскі з Кандратам Крапівой — беларускі паэт Паўлюк Трус, які пражыў у чатыры разы менш за Крапіву. Памятаеце цудоўныя радкі — *«Падаюць сняжынкі, дыяменты-росы»*? Гэта з яго паэмы... Сям'я Паўлюка Труса — пагарэльцы. Пераехалі ў Нізок з суседняй вёскі. Паўлюк на сваю жабрацкую стыпендыю і сціплыя ганарары да апошняга памагаў радзіне... Памёр на мінскім вакзале, заразіўшыся тыфам у камандзіроўцы.

А Сымон Баранавых з вёскі Рудакова Уздзенскага раёна ад пачатку быў з прозвішчам Баран, як і ўсе продкі... Узяў псеўданім па парадзе сябра, Янкі Скрыгана. Эксперыментатар быў у прозе... *«Месяц глыбей запусціў у чорнае неба свае клыкі, больш сярдзітым зрабіўся. Як дзікі кабан, наставіўшы хіб, хацеў рынуцца і распароць адвіслы жывот чарназорнаму небу — парадзісе ваўчыцы, хацеў раніць яго аж да самай крыві»*. Памёр на Калыме, арыштаваны па беспадстаўным абвінавачванні.

З Уздзеншчыны — Ілья Гурскі, Алесь Якімовіч, Пятро Глебка, Алесь Пальчэўскі, Антон Бялевіч. А таксама Алесь Махнач, адзін з абаронцаў Брэсцкай крэпасці, стагоддзе якога адзначаецца сёлета... Менавіта Алесь Махнач высветліў, што дзед Янкі Купалы — з ягонай роднай вёскі Забалацце...

Так, адсюль родам Ануфрый Луцэвіч. Той самы, які спрабаваў пацвердзіць сваё шляхецтва, ездзіў, ездзіў у Санкт-Пецярбург, грошай нямерана страціў... Ды так і не дамогся справядлівасці. Род прыпісалі да мяшчан... Водгукі тае трагедыі, нелюбоў да бяздушных чыноўнікаў адчуваюцца ў многіх творах Купалы...

А вось і касцёл Узвышэння Святога Крыжа, дзе хрысцілі таго Ануфрыя Луцэвіча, а пасля ягонага сына, Дамініка Луцэвіча, бацьку Янкі Купалы. Пабудаваны ў 1798 годзе з дрэва генералам Казімірам Завішам, уладальнікам мястэчка. Літаратурная гісторыя храма не абмяжоўваецца гэтым — у школе пры касцёле вучыўся паэт Тамаш Зан.

Будынак уражвае... Драўляны, там, дзе не пафарбавана, — шэры, жоўты франтон, белыя калоны... Да касцёла падысці мы не змаглі — вакол агароджа, брама зачынена. У 1930-я тут зладзілі клуб, потым раённы цэнтр культуры. Здаецца, будынак прададжэны, павінна адбыцца рэканструкцыя... Як нам паведамілі, ёсць музей свечак...

Давялося проста абысці вакол, здымаючы з-за агароджы. Побач, дарэчы, нядаўна паўстаў новы касцёл з той жа назвай. Застаецца спадзявацца, што стары храм захаваецца і папрыгажэе — без згубы аўтэнтычнасці... Бо шмат мы бачылі рэстаўрацый і рэканструкцый, пасля якіх плакаць па страчаным хочацца, хоць усё нібыта і «красівенька».

Дзень беларускага пісьменства адбудзецца далёка ад гэтых месцаў, у Добрушы. Але і там будуць гучаць імёны і прадавацца кнігі ўраджэнцаў Уздзеншчыны. Не абмінайце ж Узду на сваіх турыстычных шляхах.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Новы брэнд

МАТУЛІН КАРАВАЙ, БУЛАЧНАЯ ЭСТАФЕТА І БУЛКА-ГАДАЛКА...

У Свіслачы нарадзілася новае свята рэспубліканскага маштабу — «Бацькава булка»

Ідэя ўзнікла пасля наведвання Прэзідэнтам мясцовай пякарні ў чэрвені мінулага года. Аляксандр Лукашэнка высока ацаніў смак свіслацкага хлеба, асабліва — здобнай пляцёнкі — «са смакам дзяцінства». Гэта надало штуршок для «раскруткі» плеценай булкі, якая ў хуткім часе атрымала афіцыйную назву «Бацькава». А сёлета ў гонар папулярнай здобы ў Свіслачы зладзілі фестываль.

Рыхтаваў свята спецыяльна створаны аргкамітэт пры Гродзенскім абласным упраўленні культуры. Асноўную праграму распрацаваў Свіслацкі цэнтр культуры і народнай творчасці. На конкурсе «Бацькаўшчына», напрыклад, прафесійныя пекары прадставілі ў выпечцы гістарычныя аб'екты Беларусі. Тут знайшлі адлюстраванне і Белавежская пушча, і гродзенскія замкі, і старажытныя сядзібы...

Госці фестывалю маглі дэгуставаць духмяную выпечку, а таксама ўзяць удзел у майстар-класах: сплесці ўласную «Бацькаву булку», зрабіць сухарную кветку альбо ўпрыгожыць пернік...

Цікавым стаў конкурс «Матулін каравай». У ім удзельнічалі ўсе ахвотныя, у тым ліку аматары і хатнія гаспадыні. Сваё майстэрства ў кулінарным спаборніцтве яны дэманстравалі ў

Фота БелТА.

Старшыня Свіслацкага райвыканкама Аляксандр ВЯРСОЦКІ.

дзвюх намінацыях: «Традыцыйны каравай» і «Сучасны каравай».

«Традыцыйны» — згатаваныя ў хатніх умовах па традыцыйным рэцэпце пірог, каравай ці булка. Віталася, калі выраб мае сямейную гісторыю. У намінацыі «Сучасны каравай» спаборнічалі тэматычныя кампазіцыі. Гэта мог быць пірог ці торт, у тым ліку з гатовых інгрэдыентаў, напрыклад, пернікавы ці зефірны. Тут кожны мог прыкласці сваю фантазію і здольнасці. Усе вырабы мелі назвы.

Але мала толькі смачна прыгатаваць. Яшчэ трэба цікава прэзентаваць, расказаць пра тэхналогію, рэцэптуру, гісторыю, чаму менавіта такі рэцэпт стаў у сям'і традыцыйным, у чым яго адметнасць.

Пераможцы атрымалі ўзнагароды і грашовыя прэміі. Адзначаны канкурсанты і ў спецыяльных намінацыях: «Кулінарная спадчына», «Смак дзяцінства», «Самы вялікі каравай», «Арыгінальная прэзентацыя», «Незвычайнае спалучэнне інгрэдыентаў», «Арыгінальнае афармленне».

Асобны конкурс прайшоў для прафесійных пекараў і кандытараў. Яны таксама прадставілі вялікі асартымент вырабаў, якія трапляюць да спажыўцоў не толькі вобласці, але і ўсёй краіны.

Падчас фэсту працаваў шэраг цікавых лакацый. Напрыклад, лаўнж-зона для адпачынку, дзе булка-гадалка ў жартоўнай форме прадказвала кожнаму наведвальніку яго лёс.

Экскурсія з майстар-класам паведаміла аб шляху збожжа да хлеба. Тут адбылася дэманстрацыя старажытных сельскагаспадарчых прылад. А на старых млынавых жорнах можна было памалоць зярняты.

Усе конкурсы так ці інакш звязаныя з «хлебнай» тэмай. Напрыклад, у эстафетным конкурсе «Бацькава міля» каманды на хуткасць перавозілі на тачцы мяхі са збожжам. У конкурсе «Каравай, каравай, каго хочаш — выбірай» кожная пара ўдзельнікаў з завязанымі вачамі адной рукой упакоўвала булку.

Такі фэст тут праводзіцца ўпершыню. Ініцыятарам яго стаў старшыня Свіслацкага райвыканкама Аляксандр Вярсоцкі. Спачатку свята задумвалася як мясцовае, але падчас падрыхтоўкі яно набыло размах і перарасло ў рэспубліканскае.

Дарэчы, на Слонімшчыне захавалася традыцыя выпечкі так званых паўлаўскіх караваяў, якія ўваходзяць у Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Захоўваюць унікальную тэхналогію ўдзельніцы народнага аб'яднання «Чараўніцы-каравайніцы» з Навасёлкаўскага цэнтра культуры. На Слонімшчыне фестываль стаў брэндавым. А самы прыгожы трохпавярховы каравай паўлаўскія каравайніцы двойчы ўручалі Прэзідэнту краіны.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Сваё. Роднае

Добра спіцца ў... музеі

Незвычайны праект рэалізоўваецца ў комплексным музеі «Гісторыя Заронаўскага краю» Заронаўскага сельсавета, што ў Віцебскім раёне. Юныя экскурсаводы асвойваюць заняткі нашых продкаў і праводзяць у музеі цэлую ноч.

Комплексны музей у Заронаве — цэнтр патрыятычнага і адукацыйнага выхавання не толькі раёна, але і ўсёй Віцебшчыны. Восем экспазіцыйных залаў, захапляльны аповед выключна на беларускай мове і звыш 30 тысяч экспанатаў — сюды ў любую пару няспынна едуць зацікаўленыя экскурсанты, а за год музей прымае звыш 2000 чалавек. Дзіва: некалі маленькі школьны музей баявой славы за 36 гадоў ператварыўся ў адно з самых папулярных месцаў у паўночным рэгіёне.

Прыцягваюць увагу турыстаў не толькі этнаграфічная, настальгічная, калекцыйная залы, але і сапраўдная партызанская зямлянка. А яшчэ ў Заронаве жывуць нячысцікі — Аржавень, Ягіня, Вірнік, міфалагічныя істоты вядомага беларускага этнографа Мікалая Нікіфароўскага знайшлі прапіску ў шостай зале музея. Акрамя безлічы цікавых прадметаў, а некаторыя тут прадстаўлены ў адзінкавых экзэмплярах, кожны жадаючы можа прымераць касцюмы розных нацыянальнасцяў, пабыць падпалкоўнікам ці нявестай — не хоціць часу, каб наведаць усе інтэрактывы.

Яшчэ адной «разыначкай» музея (акрамя самой яго стваральніцы Людмілы Нікіцінай) з'яўляюцца юныя экскурсаводы. Гэта тутэйшыя дзеці, для якіх установа сапраўды стала другім домам. З імі захавальнікі музейных каштоўнасцяў Людміла і Станіслаў Нікіціны нястомна спасцігаюць асновы экскурсійнага мастацтва, вучаць любіць малую радзіму і добрымі справамі рабіць свой куток яшчэ

лепшым. Самая маленькая экскурсавод Каця Паніна толькі ідзе ў першы клас, а ўжо бывалыя — выпускнікі ВНУ, якія таксама час ад часу прымаюць у музеі гасцей. Усяго дапамагае Нікіцінай каля 15 дзяцей, кожны з іх абавязкова расказвае пра экспанаты, звязаныя са сваёй сям'ёй. Напрыклад, сястрычкі Маша і Лена Івановы вядуць аповед пра вышытыя іконы — захапленне іх маці, а Мікіта Шыбека — пра ледабур, які падарыў музею яго дзядуля Саша. У гэтым і ёсць асноўная мэта музейнай работы — каб чалавеку ведаць, адкуль карані твае, адкуль твой род пачаўся.

Акрамя экскурсій, на якія ў летні перыяд ствараецца чарга, Нікіціны разам з дзецьмі ладзяць турыстычныя маршруты, вела- і аўтапрабегі, пазнаюць Беларусь. «Важна, каб дзеці захапляліся музейным жыццём, таму кожны раз прыдумваем нешта новае», — расказвае Людміла Канстанцінаўна. Тры гады таму вырашылі стварыць асабісты праект «Ноч у музеі». Усім знаёмая з'ява «Ноч музеяў» 18 мая, калі многія ўстановы працуюць для наведвальнікаў бясплатна, але праект у Заронаве — справа зусім іншая і нават больш цікавая. Дзеці, якія праводзяць у комплексе шмат часу, заўсёды хацелі застацца там і ноччу: некаторыя верылі, што, як у знакамітым кіно, прадметы ажываюць, а для некаторых утульная атмасфера ў будынку спрыяе вясёламу начлегу. Сказана — зроблена! Жнівень малыя заўсёды чакаюць з нецярпеннем, бо можна з падушкамі і коўдрамі крочыць у музей.

Мне таксама давялося застацца на ноч у музеі. Збіраемся а чацвёртай гадзіне дня. Спачатку «працоўная тэрапія» — наводзім парадак на тэрыторыі і на воінскім мемарыяле. Пасля хлопцы выпраўляюцца пад кіраўніцтвам Станіслава Пятровіча капаць бульбу на вячэру і збіраць дровы для печкі, якая, дарэчы, у музеі сапраўдная, у ёй гатуюць стравы нацыянальнай беларускай кухні. У гэты дзень, які здараецца толькі раз на год, можна навучыцца паліць у печы, што з ахвотай робяць экскурсаводы. Дзяўчаты спасцігаюць азы кулінарнага мастацтва і накрываюць на стол. Пасля тушанай бульбы і смачнага шашлыку час заняцца гаспадарскімі справамі, а канкрэтна, асвоіць касьбу з дапамогай экспаната — ручной касы. Так, многія прадметы ў экспазіцыях — не проста не прыдатныя ад часу рэчы, а прыстасаваныя, якімі з лёгкасцю можна карыстацца пры патрэбе. У чаргу на гэты незвычайны занятак, якім не дазваляюць займацца дома, выстройваюцца і дзяўчынкі, і хлопчыкі. А ўвечары ў кола збірае ўсіх музейнае вогнішча з песнямі і пужалкамі, як любяць дзеці. Хутка час рыхтавацца да сну: месца хапае і на канапе, і на лаўках, але вырашаем класціся на падлозе — так весялей. Пад гітарныя акорды калыханкі, стомленыя, але шчаслівыя, трапляем у абдымкі Марфея.

Раніцай, нават не паспелі яшчэ некаторыя адкрыць вочы, учарашнія навічкі,

а сённяшнія прафесіяналы па паленні ў печы Ваня Мяшкоў і Антон Галаўнёў ужо па-майстэрску расклалі агонь. Аладкі ў печы ад Людмілы Канстанцінаўны — яшчэ адна добрая традыцыя праекта, якую з нецярпеннем чакаюць экскурсаводы. У садзе пад яблынямі гарачыя і духмяныя, падобныя да сонейкаў, надта смачныя. А дадаць яшчэ варэнне і гарбату — увогуле найвялікшая асалода. Асабліва калі ўсе, як адна сям'я, збіраюцца за вялікім сталом. Дзелімся эмоцыямі і складаем план на наступную «Ноч у музеі», якая кожны год праходзіць па-рознаму, але заўсёды пакідае яркія ўражанні.

«Музей — наш гонар, месца, якое аб'ядноўвае людзей рознага ўзросту і статусу, бо тут асаблівая атмасфера дружбы і адзінства. «Ноч у музеі» — унікальны праект, які не мае меж і можа стаць цікавым прыкладам для іншых музейных устаноў», — рэзюмавала **выконваючая абавязкі старшыні Заронаўскага сельсавета Алеся СІНЯКОВА.**

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

23 августа 2022 года в издательском доме «Звязда» опубликована проектная декларация на строительство жилого микрорайона в газете Смолевичи (микрорайон Липки).

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ № 4

На строительство объекта:

«Строительство жилого микрорайона в г. Смолевичи (микрорайон Липки)». II очередь строительства. Индивидуальные жилые дома, КПП, ограждение территории. II пусковой комплекс.».

Информация о застройщике:

Застройщик: производственно-строительное закрытое акционерное общество «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 8 ноября 2000 года № 1266, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100011299.

Юридический (почтовый) адрес: 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 100-817.

Режим работы для приема заявлений и заключения договоров: Понедельник – пятница с 9.00 до 18.00.

Производственно-строительное закрытое акционерное общество «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» в качестве заказчика построило следующие объекты:

- Бизнес-центр Покровский, г. Минск, пр-т Победителей, д. 100, нежилой фонд,
- Многоквартирный жилой дом г. Минск, ул. К. Чорного, д. 25, жилой фонд,
- Санаторно-курортный комплекс «Плисса», Витебская область, Глубокский район, деревня Плиса, улица Гвардейская, дом 4, нежилой фонд.

Перечень объектов, построенных за последних три года:

- Храм-памятник в честь Всех Святых, г. Минск, ул. Калиновского 121, нежилой фонд.

Информация о проекте:

Проектно-сметная документация прошла государственную экспертизу в установленном порядке, получено положительное заключение РУП «Госстройэкспертиза по Минской области» от 28.10.2020г. № 1635-70/20.

Проектная документация разработана на основании разрешительной документации в составе:

- акт выбора места размещения земельного участка, предоставленного в постоянное пользование, утвержденного от 07.10.2019 г.;
- решение Смолевичского районного исполнительного комитета «О разрешении производственно-строительному закрытому акционерному обществу «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» строительства объекта» от 17.11.2020 г. № 2971;
- решение Смолевичского районного исполнительного комитета «О разрешении производственно-строительному закрытому акционерному обществу «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» строительства объекта» от 18.05.2021 г. № 1279.

Участок площадью 12,8621 га передан производственно-строительному закрытому акционерному обществу «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» на основании договора аренды земельного участка от 22.11.2019 г. № 2272 для строительства жилого микрорайона. Свидетельство (удостоверение) от 02.12.2019 № 614/828-15837 о государственной регистрации земельного участка с кадастровым номером 624850100008000760.

Застройщиком по строительству объекта выступает производственно-строительное закрытое акционерное общество «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ».

Функции подрядчика индивидуального жилого дома исполняет:

по генплану № 45 (тип 10): ПС ЗАО «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ»;

Этапы и сроки строительства:

- срок начала строительства объекта – I квартал 2022 г.;
- окончание строительства объекта – I квартал 2023 г.

по генплану № 73 (тип 9.1): ПС ЗАО «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ»;

Этапы и сроки строительства:

- срок начала строительства объекта – III квартал 2022 г.;
- окончание строительства объекта – III квартал 2023 г.

Местонахождение объекта: в микрорайоне Липки г. Смолевичи.

Цель строительства: возведение индивидуальных жилых домов.

Характеристика объекта: строительным проектом предусмотрено строительство жилого микрорайона в г. Смолевичи Минской область (микрорайон Липки) в количестве 85 индивидуальных жилых домов.

Общая площадь по СНБ одноквартирного жилого дома по генплану № 45 (тип 10) составляет 104,7 кв. м, в доме 1-й этаж.

Общая площадь по СНБ одноквартирного жилого дома по генплану № 73 (тип 9.1) составляет 139,24 кв. м, в доме 2-й этажа.

Строительство объектов долевого строительства будет осуществляться в соответствии со строительным проектом и заключенными договорами создания объектов долевого строительства.

По настоящей проектной декларации для категории граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц предлагаются для заключения договоров создания объектов долевого строительства следующие объекты долевого строительства:

Индивидуальный жилой дом, № по генплану	Стоимость 1м², бел. руб.
№ 45 (тип 10)	2 570,50
№ 73 (тип 9.1)	2 169,00

- на индивидуальный жилой дом по генплану № 45, 73.

Для лиц, заключивших договоры создания объекта долевого строительства, цена 1 кв. м, определенная в договоре, является неизменной до окончания строительства. Плата объекта долевого строительства производится дольщиком в соответствии с графиком платежей.

По согласованию сторон допускается изменение порядка расчета по оплате объекта долевого строительства с заключением дополнительного соглашения к договору.

Состав общего имущества: внутриквартальная автодорога, тротуары, сети, освещение, внутриплощадочные сети, электро-, газо- и водоснабжение, канализация, элементы благоустройства.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходом работ по его строительству можно получить по адресу: 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 100-817 или по тел. +375 29 390-01-01.

Принятие и регистрация заявлений осуществляется с первого дня с даты публикации настоящей проектной декларации. Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

По истечении 7 дней с даты публикации настоящей проектной декларации и до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству задекларированных индивидуальных жилых домов, производится заключение договоров долевого строительства. Для заключения необходимо личное присутствие дольщика и его паспорт.

Если гражданин, либо иной претендент на участие в долевом строительстве, в течение 7 (семь) рабочих дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное помещение с другим претендентом.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45 (46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте gastello.by

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества ГОУПП «Гродненская типография» (УНП 500013667), объявляет о проведении **02.09.2022 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме. Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by**

